Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МІНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 252 (6529) | 1 лістапада 1939 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Учора ў Маскве адкрылася Ўнечарговая Пятая Сесія Вярхоўнага Совета СССР

УНЕЧАРГОВАЯ ПЯТАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР ПЕРШАГА СКЛІКАННЯ

АБ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ СОВЕЦКАГА САЮЗА

Даклад Старшыні Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. В. М. МОЛАТАВА на паседжанні Вярхоўнага Совета СССР 31 кастрычніка 1939 г.

Таварышы дэпутаты!

За апошнія два месяцы ў міжнароднай абстаноўцы адбыліся важныя змяненні. Гэта адносіцца, перш за ўсё, да становішча ў Еўропе, але таксама і да краін, якія знаходзяцца далёка за прадзеламі Еўропы. У сувязі з гэтым трэба ўказаць на тры асноўныя акалічнасці, якія маюць рашаючае значэнне.

Па-першае, трэба ўказаць, на змяненні, якія адбыліся ў адносінах паміж Совецкім Саюзам і Германіяй. З часу заключэння 23 жніўня совецка-германскага дагавора аб ненападзе быў пакладзен канец ненармальным адносінам, існаваўшым на працягу раду год паміж Совецкім Саюзам і Германіяй. На змену варожасці, усяляк падгараваўшайся з боку некаторых еўрапейскіх дзяржаў, прышло збліжэнне і ўстанаўленне дружаственых адносін паміж СССР і Германіяй. Далейшае паляпшэнне гэтых новых, добрых адносін знайшло сваё выражэнне ў германа-совецкім дагаворы аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй, падпісаным 28 верасня ў Маскве. Круты паварот, які адбыўся ў адносінах паміж Совецкім Саюзам і Германіяй, паміж двума самымі буйнымі дзяржавамі Еўропы, не мог не сказацца на ўсім міжнародным становішчы. Пры гэтым падзеі палкам пацвердзілі тую ацэнку палітычнага значэння совецка-германскага збліжэння, якая была дана на мінулай Сесіі Вярхоўнага Совета.

Па-другое, трэба ўказаць на такі факт, як ваенны разгром Польшчы і распад польскай дзяржавы. Правячыя кругі Польшчы не мала кічыліся «моцнасцю» сваёй дзяржавы і «магутнасцю» сваёй арміі. Аднак, аказалася дастатковым кароткага ўдару па Польшчы з боку спачатку германскай арміі, а затым — Чырвонай Арміі, каб нічога не асталося ад гэтага ўродлівага дзецішча версальскага дагавора, жыўшага за кошт прыгнечання няпольскіх нацыянальнасцей. «Традыцыйная палітыка» беспрынцыпнага лавіравання і ігры паміж Германіяй і СССР аказалася несастаяльнай і поўнасцю абанкроцілася.

Па-трэцяе, трэба прызнаць, што выбухнуўшая ў Еўропе вялікая вайна ўнесла карэнныя змяненні ва ўсю міжнародную абстаноўку. Гэтая вайна пачалася паміж Германіяй і Польшчай і ператварылася ў вайну паміж Германіяй — з аднаго боку, Англіяй і Францыяй — з другога боку. Вайна паміж Германіяй і Польшчай закончылася быстра, з прычыны поўнага банкроцтва польскіх кіраўнікоў. Польшчы, як вядома, не дапамаглі ні англійскія, ні французскія гарантыі. Да гэтага часу, уласна, так і невядома, што гэта былі за «гарантыі» **(Агульны смех).** Пачаўшаяся паміж Германіяй і англа-французскім блокам вайна знаходзіцца толькі ў сваёй першай стадыі і па-сапраўднаму яшчэ не разгарнулася. Тым не менш, зразумела, што такая вайна павінна была ўнесці карэнныя змяненні ў становішча Еўропы, ды і не толькі Еўропы.

У сувязі з гэтымі важнымі змяненнямі міжнароднай абстаноўкі, некаторыя старыя формулы, якімі мы карысталіся яшчэ нядаўна, — і да якіх многія так прывыклі — яўна ўстарэлі і цяпер непрымянімы. Трэба аддаць сабе ў гэтым адчот, каб унікнуць грубых памылак у апэнцы склаўшагася новага палітычнага становішча ў Еўропе.

Вядома, напрыклад, што за апошнія некалькі месяцаў такія паняцці, як «агрэсія», «агрэсар» атрымалі новы канкрэтны змест, набылі новы сэнс. Не цяжка здагадацца, што цяпер мы не можам карыстацца гэтымі паняццямі ў тым-жа сэнсе, як, скажам, 3—4 месяцы таму назад. Цяпер, калі гаварыць аб вялікіх дзяржавах Еўропы, Германія знаходзіцца ў становішчы дзяржавы, якая імкнецца да хутчэйшага сканчэння вайны і да міру, а Англія і Францыя, учора яшчэ ратаваўшыя супроць агрэсіі, стаяць за працяг вайны і супроць заключэння міру. Роль, як бачыце, мяняюцца.

Спробы англійскага і французскага ўрадаў апраўдаць гэтую сваю новую пазіцыю данымі Польшчы абавязацельствамі, зразумела, яўна несастаяльны. Аб адпаўленні старай Польшчы, як кожнаму зразумела, не можа быць і гутаркі. Таму бессэнсоўным з'яўляецца прапяг цяперашняй вайны пад сцягам аднаўлення ранейшай польскай дзяржавы. Разумеючы гэта, урады Англіі і Францыі, аднак, не хочуць спынення вайны і аднаўлення міру, а шукаюць новага апраўдання для працягу вайны супроць Германіі.

У апошні час правячыя кругі Англіі і Францыі прабуюць паказаць сябе ў якасці барацьбітоў за дэмакратычныя правы народаў супроць гітлерызма, прычым англійскі ўрад аб'явіў, што нібы для яго мэтай вайны супроць Германіі з'яўляецца, не больш і не менш, як «знішчэнне гітлерызма». Атрымліваецца так, што англійскія, а разам з імі і французскія, староннікі вайны аб'явілі супроць Германіі штосьці накшталт «ідэалагічнай вайны», напамінаючай старыя рэлігійныя войны. Сапраўды, у свой час рэлігійныя войны супроць ерэтыкаў і інаверцаў былі ў модзе. Яны, як вядома, прывялі да цягчайшых для народных мас вынікаў, да гаспадарчага разарэння і да культурнага адзічання народаў. Нічога іншага гэтыя войны і не маглі даць. Але гэтыя войны былі ў часы сярэдневяковя, да часоў рэлігійных войн, забабонаў і культурнага адзічання цягнуць нас зноў пануючыя класы Англіі і Францыі? Ва ўсякім выпадку, пад «ідэалагічным» сцягам цяпер зацеяна вайна яшчэ большага маштаба і яшчэ большых небяспек для народаў Еўропы і ўсяго свету. Але такога роду вайна не мае для сябе ніякага апраўдання. Ідэалогію гітлерызма, як і ўсякую іншую ідэалагічную сістэму, можна прызнаваць або адмаўляць, гэта — справа палітычных поглядаў. Але любы чалавек зразумее, што ідэалогію нельга знішчыць сілай, нельга пакончыць з ёю вайной. Таму не толькі бессэнсоўна, але і злачынна весці такую вайну, як вайна за «знішчэнне гітлерызма», прыкрываемая фальшывым сцягам барацьбы за «дэмакратыю». На самой справе, ніяк нельга назваць барацьбой за дэмакратыю такія дзеянні, як закрыццё камуністычнай партыі ва Францыі, арышты камуністычных дэпутатаў французскага парламента або ўрэзванне палітычных свабод у Англіі, неаслабяваючы нацыянальны гнёт у Індыі і т. п.

Ці не ясна, што мэта цяперашняй вайны ў Еўропе не ў тым, аб чым гавораць у афіцыяльных выступленнях для шырокага круга слухачоў ва Францыі і Англіі, г. зн. не ў барацьбе за дэмакратыю, а ў чымсьці другім, аб чым не гавораць гэтыя паны адкрыта.

Сапраўдная прычына англа-французскай вайны супроць Германіі не ў тым, што Англія і Францыя пакляліся нібы аднавіць былую Польшчу, і, вядома, не ў тым, што яны рашылі нібы ўзяць на сябе задачу барацьбы за дэмакратыю. У правячых кругоў Англіі і Францыі ёсць, зразумела, іншыя, больш сапраўдныя матывы для вайны супроць Германіі. Гэтыя матывы адносяцца не да галіны якой-небудзь ідэалогіі, а да сферы іх сугуба матэрыяльных інтарэсаў, як магутных каланіяльных дзяржаў.

Брытанская імперыя, насельніцтва якой дасягае 47 мільёнаў, улада ладе каланіямі з насельніцтвам у 480 мільёнаў чалавек. Каланіяльная імперыя Францыі, насельніцтва якой не перавышае 42 мільёнаў, ахватвае 70 мільёнаў жыхароў ва французскіх калоніях. Улаланне гэтымі калоніямі, даючае магчымасць эксплаатаваць сотні мільёнаў людзей, з'яўляецца асновай сусветнага панавання Англіі і Францыі. Страх перад германскімі дамаганнямі на гэтыя каланіяльныя ўладанні — вось у чым палаплёка цяперашняй вайны Англіі і Францыі супроць Германіі, якая сур'ёзна ўсілілася за апошні час ў рэзультаце развалу версальскага дагавора. Апасенні за страту сусветнага панавання дыктуюць правячым кругам Англіі і Францыі палітыку распальвання вайны супроць Германіі.

Такім чынам, імперыялістычны характар гэтай вайны відавочны для кожнага, хто хоча бачыць сапраўднае становішча спраў, хто не закрывае вачэй на факты.

З усяго гэтага відаць, каму патрэбна гэта вайна, якая вядзецца з-за сусветнага панавання. Вядома, не рабочаму класу. Такая вайна не абяцае рабочаму класу нічога, апрача крывавых афэр і бедствяў.

Пасля гэтага, мяркуйце самі: змяніўся ці не змяніўся за апошні перыяд змест такіх паняццяў, як «агрэсія», «агрэсар». Не цяжка бачыць, што ўжыванне гэтых слоў у старым сэнсе, — гэта значыць, як гэта было да апошняга рашучага павароту ў палітычных адносінах паміж Совецкім Саюзам і Германіяй і да пачатку вялікай імперыялістычнай вайны ў Еўропе, — можа паралізаваць толькі блытаніну ў галовах і непазбежна будзе штурхаць да памылковых вывадаў. Каб гэтага не здарылася, мы не павінны дапускаць некрытычных адносін да тых старых паняццяў, якія непрымянімы ў новай міжнароднай абстаноўцы.

Так склалася міжнародная абстаноўка ў апошні перыяд.

Пяройдзем да змяненняў, якія адбыліся ў знешнім становішчы самога Совецкага Саюза. Змяненні тут адбыліся не маленькія, але, калі гаварыць аб галоўным, то нельга не прызнаць наступнага: ізякуючы паслядоўнаму правядзенню сваёй мірнай знешняй палітыкі, нам удалося значна ўзмацніць свае пазіцыі і міжнародную вагу Совецкага Саюза. **(Працяглыя апладысменты).**

Нашы адносіны з **Германіяй**, як я ўжо сказаў, палепшыліся карэнным чынам. Тут справа развівалася па лініі ўмацавання дружаственых адносін, развіцця практычнага супрацоўніцтва і палітычнага падтрымання Германіі ў яе імкненнях да міру.

Заключаны паміж Совецкім Саюзам і Германіяй дагавор аб ненападзе абавязваў нас да нейтралітэта ў выпадку ўдзелу Германіі ў вайне. Мы паслядоўна праводзілі гэтую лінію, чаму ніяк не супярэчыць уступленне нашых войск на тэрыторыю былой Польшчы, якое пачалося 17 верасня. Дастаткова напомніць, што тады-ж, 17 верасня, совецкі ўрад разаслаў усім дзяржавам, з якімі ён мае дыпламатычныя адносіны, спецыяльную ноту з заявай аб тым, што СССР і надалей будзе праводзіць палітыку нейтралітэта ў адносінах з імі. Як вядома, нашы войскі ўступілі на тэрыторыю Польшчы толькі пасля таго, як польская дзяржава распалася і фактычна перастала існаваць. Аставацца нейтральнымі да такіх фактаў мы, зразумела, не маглі. У рэзультаце гэтых падзей перад намі паўсталі вострыя пытанні безапаснасці нашай дзяржавы.

Да таго-ж совецкі ўрад не мог не лічыцца з выключным становішчам, што стварылася для брацкага насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, якое ў разваліўшайся Польшчы аказалася кінутым на волю лёсу.

Паследуючыя падзеі поўнасцю пацвердзілі, што новыя совецка-германскія адносіны пабудаваны на моцнай базе ўзаемных інтарэсаў. Пасля ўступлення часцей Чырвонай Арміі на тэрыторыю былой польскай дзяржавы ўзніклі сур'ёзныя пытанні разгранічэння дзяржаўных інтарэсаў СССР і Германіі. Гэтыя пытанні былі быстра ўрэгуліраваны па ўзаемнай згодзе. Германа-совецкі дагавор аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй, заключаны ў канцы верасня, замацаваў нашы адносіны з германскай дзяржавай.

Адносіны Германіі з іншымі заходнееўрапейскімі буржуазнымі дзяржавамі за апошнія два дзесяцігоддзі вызначаліся, перш за ўсё, імкненнем Германіі разбіць путы версальскага дагавора, тварцамі якога былі Англія і Францыя пры актыўным удзеле Злучаных Штатаў Амерыкі. Гэта, у канчатковым выніку, і прывяло да цяперашняй вайны ў Еўропе.

Адносіны Совецкага Саюза з Германіяй будаваліся на іншай аснове, не маючай нічога агульнага з інтарэсамі ўвекавечання пасляваеннай версальскай сістэмы. Мы заўсёды былі той думкі, што сільная Германія з'яўляецца неабходнай умовай моцнага міру ў Еўропе. Было-б смешна думаць, што Германію можна «проста вывесці са строю» і скінуць са шчотаў. Дзяржавы, пястуючыя гэтую глупую і небяспечную меру, не ўлічваюць сумнага вопыту Версаля, не аддаюць сабе адчоту ва ўзросшай магутнасці Германіі і не разумеюць таго, што спроба паўтарыць Версаль пры цяперашняй міжнароднай абстаноўцы, якая ў корані адрозніваецца ад абстаноўкі 1914 года, — можа скончыцца для іх крахам.

Мы няўхільна імкнуліся да паляпшэння адносін з Германіяй і ўсямерна віталі такога роду імкненні ў самой Германіі. Цяпер нашы адносіны з германскай дзяржавай пабудаваны на базе дружаственых адносін, на гатоўнасці падтрымліваць імкненні Германіі да міру і, разам з тым, на жаданні ўсямерна садзейнічаць развіццю совецка-германскіх гаспадарчых адносін к узаемнай карысці абодвух дзяржаў. Трэба спецыяльна адзначыць, што змяненні ў палітычнай галіне, якія адбыліся ў совецка-германскіх адносінах, стварылі спрыяючыя прадпасылкі для развіцця совецка-германскіх гаспадарчых адносін. Апошнія гаспадарчыя перагаворы германскай дэлегацыі ў Маскве і адбываючыяся ў даны момант перагаворы совецкай гаспадарчай дэлегацыі ў Германіі падрыхтоўваюць шырокую базу для развіцця таваразвароту паміж Совецкім Саюзам і Германіяй.

Цяпер дазвольце спыніцца на падзеях, непасрэдна звязаных з уступленнем нашых войск на тэрыторыю былой польскай дзяржавы. Мне няма неабходнасці апісваць ход гэтых падзей. Аб усім гэтым падрабязна гаварылася ў нашым друку, і вы, таварышы дэпутаты, добра знаёмы з фактычнай стараной. Скажу толькі аб самым істотным.

Няма чаго даказваць, што ў момант поўнага распаду польскай дзяржавы наш урад абавязан быў працягнуць руку дапамогі пражываючым на тэрыторыі **Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі** братам-украінцам і братам-беларусам. Ён так і паступіў. **(Бурныя, працяглыя апладысменты, дэпутаты ўстаюць і апладзіруюць авацыю).**

Чырвоная Армія ўступіла ў гэтыя раёны пры ўссагульным спачуванні украінскага і беларускага насельніцтва, сустракаўшага нашы войскі, як сваіх вызваліцеляў ад панскага гнёту, ад гнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Пры баявым прасоўванні Чырвонай Арміі па гэтых раёнах у нашых воінскіх часцей былі месцамі сур'ёзныя сутычкі з польскімі часцямі, а, стала быць, былі і афіры. Якія былі гэтыя афіры, відаць з наступнага. На Беларускім фронце ў часцях Чырвонай Арміі, лічачы пачальствуючы і радавы састаў, мы мелі забітых — 246 і раненых—503, а ўсяго—749. На Украінскім фронце мы мелі забітых з пачальствуючага і радавога састава — 491 і раненых — 1.359, а ўсяго — 1.850. Значыць, агульная колькасць афір, панесеных Чырвонай Арміяй на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, складае: забітых 737, раненых — 1.862, гэта значыць, у цэлым — 2.599 чалавек. Што датычыць нашых баявых трафеяў у Польшчы, то яны складаюць 900 з лішнім гармат, звыш 10.000 кулямётаў звыш 300 тысяч вінтовак, больш 150 мільёнаў вінтовачных патронаў, каля 1 мільёна артылерыйскіх снарадаў і да 300 самалётаў і т. д.

Перайшоўшая да СССР тэрыторыя па сваіх размерах роўна тэрыторыі вялікай еўрапейскай дзяржавы. Так, тэрыторыя Заходняй Беларусі дасягае 108 тысяч квадратных кілометраў, з насельніцтвам у 4 мільёны 800 тысяч чалавек. Тэрыторыя Заходняй Украіны складае 88 тысяч квадратных кілометраў, з насельніцтвам у 8 мільёнаў чалавек. Такім чынам, перайшоўшая да нас тэрыторыя Заходняй Украіны разам з тэрыторыяй Заходняй Беларусі складае 196 тысяч квадратных кілометраў, а яе насельніцтва — каля 13 мільёнаў чалавек, з якіх украінцаў — больш 7 мільёнаў беларусоў — больш 3 мільёнаў, палякаў — звыш 1 мільёна, яўрэяў — звыш 1 мільёна.

Палітычнае значэнне гэтых падзей пяжка пераацаніць. Усе паведамленні з Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі сведчаць аб тым, што насельніцтва з неапісуемым захапленнем сустрэла сваё вызваленне ад панскага гнёту і горача вітала новую вялікую перамогу совецкай улады. **(Узрыў доўгіх апладысментаў).** Прайшоўшыя ў апошнія дні выбары ў Народнае Сабранне Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, якія тут былі ўпершыню арганізаваны на аснове ўсеагульнага, прамога і роўнага выбарчага права, з тайнай падачай галасоў, паказалі, што, па крайняй меры, 9/10 насельніцтва гэтых абласцей былі ўжо даўно падрыхтаваны для з'яднання з Совецкім Саюзам. Вяломыя ўжо цяпер усім нам рашэнні Народных Сабраняў ва Львове і Беластоку сведчаць аб поўнай аднадушнасці народных выбраннікаў ва ўсіх палітычных пытаннях.

Пяройдзем да нашых адносін з прыбалтыйскімі краінамі. Як вядома, і тут адбыліся істотныя змяненні.

У аснове адносін Совецкага Саюза з **Эстоніяй, Латвіяй і Літвой** ляжаць адпаведныя мірныя дагаворы, заключаныя ў 1920 годзе. Па гэтых дагаворах Эстонія, Латвія і Літва атрымалі самастойнае дзяржаўнае існаванне, прычым за ўвесь прайшоўшы перыяд Совецкі Саюз нязменна праводзіў дружаственую палітыку ў адносінах гэтых, уноў створаных, малых дзяржаў. У гэтым знайшло сваё выражэнне карэннае адрозненне палітыкі совецкай улады ад палітыкі царскай Расіі, якая зверска прытлумачала малыя народы, не давала ім якой-небудзь магчымасці самастойнага нацыянальна-дзяржаўнага развіцця і пажінула ў іх пямала пягасных успамінаў. Трэба прызнаць, што вопыт прайшоўшых двух дзесяцігоддзяў развіцця дружаственых совецка-эстонскіх, совецка-латвійскіх і совецка-літоўскіх адносін стварыў спрыяючыя прадпасылкі для далейшага ўмацавання палітычных і ўсякіх іншых адносін СССР з прыбалтыйскімі суседзямі. Гэта паказалі і апошнія ныпламатычныя перагаворы з прадстаўнікамі Эстоніі, Латвіі і Літвы, і тыя дагаворы, якія былі падпісаны ў Маскве, у рэзультаце гэтых перагавораў.

Вы ведаеце, што Совецкі Саюз заключыў такія пакты ўзаемадапамогі з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой, якія маюць буйнейшае палітычнае значэнне. Прынцыповая аснова гэтых пактаў адпавядае. Яны асновяны на ўзаемадапамозе паміж Совецкім Саюзам, — з аднаго боку, Эстоніяй, Латвіяй і Літвой, — з другога боку, уключаючы і ваенную дапамогу адзін аднаму, у выпадку нападу на каго-небудзь з іх. З прычыны асобага геаграфічнага становішча гэтых краін, якія з'яўляюцца свайго роду подступамі да СССР, асабліва з боку Балтыйскага мора, гэтыя пакты прадастаўляюць Совецкаму Саюзу магчымасць мець ваенна-марскія базы і аэрадромы ў пэўных пунктах Эстоніі і Латвіі, а ў адносінах Літвы ўстанаўліваюць сумесную з Совецкім Саюзам абарону літоўскай граніцы. Стварэнне гэтых совецкіх ваенна-марскіх баз і аэрадромаў на тэрыторыі Эстоніі, Латвіі і Літвы і ўвод некаторай колькасці чырвонаармейскіх часцей для аховы гэтых баз і аэрадромаў забяспечвае надзейную апору абароны не толькі для Совецкага Саюза, але і для саміх прыбалтыйскіх дзяржаў і, тым самым, служыць справе захавання міру, у якім зацікаўлены нашы народы.

Меўшыя месца ў апошні час ныпламатычныя перагаворы з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой паказалі, што паміж намі існуе дастатковае давер'е і патрэбнае разуменне неабходнасці ажыццяўлення гэтых ваенна-абаронных мер у інтарэсах як Совецкага Саюза, так і саміх гэтых дзяржаў. У перагаворах поўнасцю выявілася імкненне іх удзельнікаў да захавання міру і да забеспячэння безапаснасці для нашых народаў, занятых мірнай працай. Усё гэта і забяспечыла паспяховае сканчэнне перагавораў і заключэнне пактаў узаемадапамогі, маючых важнае гістарычнае значэнне.

Асобы характар указаных пактаў узаемадапамогі ніяк не азначае якога-небудзь умяшання Совецкага Саюза ў справы Эстоніі, Латвіі і Літвы, як гэта прабуюць паказаць некаторыя органы замежнага друку. Наадварот, усе гэтыя пакты узаемадапамогі цвёрда агаворваюць недатыкальнасць суверэнітэта падпісаўшых іх дзяржаў і прынцып неўмяшання ў справы другой дзяржавы. Гэтыя пакты зыходзяць з узаемнай павагі дзяржаўнай, сацыяльнай і эканамічнай структуры другой страны і павінны ўмацаваць аснову мірнага добрасуседскага супрацоўніцтва паміж нашымі народамі. Мы стаім за чэснае і пунктуальнае правядзенне ў жыццё заключаных пактаў па ўмовах поўнай узаемнасці і заяўляем, што балбатня аб советызацыі прыбалтыйскіх краін выгодна толькі нашым агульным ворагам і ўсякім антысовецкім правакатарам.

На аснове дасягнутага паляпшэння палітычных адносін з Эстоніяй Латвіяй і Літвой, Совецкі Саюз пайшоў шырока насустрач гаспадарчым патрэбам гэтых дзяржаў, заключыўшы адпаведныя гандлёвыя пагадненні. У сувязі з гэтымі гаспадарчымі пагадненнямі, тавараабарот з прыбалтыйскімі краінамі павялічваецца ў некалькі разоў і мае спрыяючую перспектыву для далейшага росту. Ва ўмовах, калі гандаль усіх еўрапейскіх краін, у тым ліку і нейтральных дзяржаў, перажывае велізарныя затрудненні, гэтыя эканамічныя пагадненні СССР з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой маюць для іх вельмі буйнае станоўчае значэнне.

Такім чынам, збліжэнне, якое адбылося паміж СССР, Эстоніяй, Латвіяй і Літвой, будзе садзейнічаць больш хуткаму ўздыму сельскай гаспадаркі, прамысловасці, транспарта і наогул народнаму добрабыту нашых прыбалтыйскіх суседзяў.

Прынцыпы совецкай палітыкі ў адносінах малых краін з асобай сілай прадэманстрыраваны на прыкладзе дагавора аб перадачы Літоўскай рэспублікі горада Вільна і Віленскай абласці. Пры гэтым літоўская дзяржава з яе насельніцтвам ў два з палавінай мільёны чалавек, значна расшырае сваю тэрыторыю, павялічвае на 550 тысяч чалавек сваё насельніцтва і атрымлівае горад Вільна, лік жыхароў якога амаль у два разы перавышае насельніцтва цяперашняй літоўскай сталіцы. Совецкі Саюз пайшоў на перадачу горада Вільна Літоўскай рэспубліцы не таму, што ў ім пераважае літоўскае насельніцтва. Не, у Вільна большасць складае нелітоўскае насельніцтва. Але совецкі ўрад лічыўся з тым, што горад Вільна, які Польшчай быў насільственна адторгнут ад Літвы, павінен належаць Літве, як такі горад, з якім звязана, з аднаго боку, гістарычнае мінулае літоўскай дзяржавы, а з другога — — нацыянальныя спадзяванні літоўскага народа. У замежным друку ўказвалася, што ў сусветнай гісторыі не было яшчэ такога выпадку, каб вялікая дзяржава па ўласнай волі аддавала малой дзяржаве такі вялікі горад. Тым ярчэй гэты акт совецкай дзяржавы дэманстрыруе яго добрую волю.

У асобным становішчы знаходзяцца нашы адносіны з Фінляндыяй. Гэта аб'ясняецца, галоўным чынам, тым, што ў Фінляндыі больш сказваюцца розпага роду знешнія ўплывы з боку трэціх дзяржаў. Бесстаронныя людзі павінны, аднак, прызнаць, што тыя-ж пытанні забеспячэння безапаснасці Совецкага Саюза і, асабліва, Ленінграда, якія стаялі ў перагаворах з Эстоніяй, стаяць і ў перагаворах з Фінляндыяй. Можна сказаць, што ў некаторых адносінах пытанні безапаснасці для Совецкага Саюза тут стаяць нават вастрэй, паколькі галоўны, пасля Масквы, горад совецкай дзяржавы — Ленінград, знаходзіцца ўсяго ў 32 кілометрах ад граніцы Фінляндыі. Гэта значыць, што Ленінград знаходзіцца ад граніцы другой дзяржавы на адлегласці меншай, чым гэта трэба для артылерыйскага абстрэлу з сучасных дальнабойных гармат. З другога боку, марскія подступы да Ленінграда таксама ў значнай меры залежаць ад таго—варожую або дружаственную пазіцыю ў адносінах да Совецкага Саюза займае Фінляндыя, якой належыць уся паўночная частка ўзбярэжжа Фінскага заліва і ўсе астравы ўзлоўж цэнтральнай часткі Фінскага заліва.

Лічыўся з такім становішчам, а таксама са стварыўшайся ў Еўропе абстаноўкай, можна разлічваць, што з боку Фінляндыі будзе праяўлена належнае разуменне.

На чым асноўваліся адносіны Совецкага Саюза з Фінляндыяй за ўсе гэтыя годы? Вядома, што асновай гэтых адносін з'яўляецца мірны дагавор 1920 года па тыпу нашых дагавораў з іншымі нашымі балтыйскімі суседзямі. Совецкі Саюз сваім свабодным волевыяўленнем забяспечыў самастойнае і незалежнае існаванне Фінляндыі. Не можа быць сумнення, што толькі совецкі ўрад, які прызнае прынцыпы свабоднага развіцця нацыянальнасцей, мог пайсці на гэты крок. Трэба сказаць, што ніякі ўрад у Расіі, апрача совецкага, не можа дапусціць існаванне незалежнай Фінляндыі ля самых варот Ленінграда. Аб гэтым красамоўна гаворыць вопыт з «дэмакратычным» урадам Керанскага-Пэрэтэлі, не гаворачы ўжо аб уладзе князя Львова-Мілюкова і, тым больш, аб царскім уладзе. Няма сумнення, гэта важная акалічнасць магла-б служыць добрай прадпасылкай для паляпшэння совецка-фінскіх адносін, у якіх, як відаць, Фінляндыя не менш зацікаўлена, чым Совецкі Саюз.

Совецка-фінскія перагаворы пачаліся нядаўна, па нашай ініцыятыве. Што з'яўляецца прадметам гэтых перагавораў? Не цяжка зразумець, што ў сучасной міжнароднай абстаноўцы, калі ў пэнтры Еўропы разгортваецца вайна паміж буйнейшымі дзяржавамі, чрэватая вялікімі нечаканасцямі і небяспекамі для ўсіх еўрапейскіх дзяржаў, — Совецкі Саюз не толькі мае права, але і абавязан прымаць сур'ёзныя меры для ўмацавання сваёй безапаснасці. Пры гэтым, натуральна, што совецкі ўрад праяўляе асобыя клопаты адносна Фінскага заліва, які з'яўляецца марскім подступам да Ленінграда, а таксама адносна той сухапутнай граніцы, якая ў жыхнебудзь 30 кілометрах навісла над Ленінградам. Я напомню, што насельніцтва Ленінграда дасягнула трох з палавінай мільёнаў, што амаль роўна насельніцтву ўсёй Фінляндыі, якая налічвае 3 мільёны 650 тысяч жыхароў. **(Вясёлае ажыўленне ў зале).**

Наўрад ці ёсць падставы спыняцца на тых небыліцах, якія распаўсюджваюцца замежнай прэсай аб прапановах Совецкага Саюза ў перагаворах з Фінляндыяй. Адны сцвярджаюць, што СССР «патрабуе» сабе г. Віпуры (Выбарг) і паўночную частку Ладажскага возера. Скажам ад сябе, што гэта — чысты вымысел і хлусня. Іншыя сцвярджаюць, што СССР «патрабуе» перадачы яму Аландскіх астравоў.

(Працяг на 2-й старонцы)

Унечарговая Пятая Сесія Вярхоўнага Совета СССР першага склікання

ПРАЦЯГ ДАКЛАДА тав. В. М. МОЛАТАВА

Гэта — такі-ж вымысел і хлусня. Балбочуць яшчэ аб якіхсьці прэтэнзіях, нібы існуючых у Совецкім Саюзе ў адносінах Швецыі і Нарвегіі. Але гэта беспардонная хлусня проста не заслугоўвае абвяржэння. **(Агульны смех).** На самой справе, нашы прапановы ў перагаворах з Фінляндыяй з'яўляюцца максімальна скромнымі і абмяжоўваюцца тым мінімумам, без якога немагчыма забяспечыць безапаснасць СССР і наладзіць дружаскія адносіны з Фінляндыяй.

Мы пачалі перагаворы з прадстаўнікамі Фінляндыі, для чаго Фінляндскі ўрад камандзіраваў у Маскву пп. Паасіківі і Танера, з прапановай заключыць совецка-фінскі пакт узаемадапамогі, прыкладна, па тыпу нашых пактаў узаемадапамогі з іншымі прыбалтыйскімі дзяржавамі. Паколькі, аднак, фінляндскі ўрад заявіў нам, што заключэнне такога пакта супярэчыла-б занятай ім пазіцыі абсалютнага нейтралітэта, мы не сталі настайваць на нашай прапанове.

Мы прапанавалі тады перайсці да канкрэтных пытанняў, у якіх мы зацікаўлены з пункту гледжання забеспячэння безапаснасці СССР і, у асаблівасці, безапаснасці Ленінграда, як з боку мора — у Фінскім заліве, так і з боку сушы, з прычыны празмернай блізасці пагранічнай лініі да Ленінграда. Мы прапанавалі дагаварыцца аб тым, каб адсунуць на поўнач ад Ленінграда на некалькі дзесяткаў кілометраў совецка-фінскую граніцу на Карэльскім перашэйку. Узамен гэтага мы прапанавалі перадаць Фінляндыі частку тэрыторыі Совецкай Карэліі, перавышаючую ў два разы тэрыторыю, перадаваемую Фінляндыяй Совецкаму Саюзу. Мы прапанавалі таксама дагаварыцца аб тым, каб Фінляндыя здала нам у арэнду на пэўны тэрмін невялікі ўчастак сваёй тэрыторыі ў раёне ўваходу ў Фінскі заліў, каб мы маглі там арганізаваць ваенна-марскую базу. Пры наяўнасці совецкай ваенна-марской базы ля паўднёвага ўваходу ў Фінскі заліў, а іменна ў Балтыйскім порце, як гэта абумоўлена совецка-эстонскім пактам узаемадапамогі, стварэнне ваенна-марской базы ля паўночнага ўваходу ў Фінскі заліў магло-б поўнасцю забяспечыць безапаснасць Фінскага заліва супроць варожых замахаў з боку іншых дзяржаў. Мы не сумняваемся ў тым, што стварэнне такой базы адпавядае інтарэсам не толькі Совецкага Саюза, але і безапаснасці самой Фінляндыі. Іншыя нашы прапановы і, у прыватнасці, наша прапанова аб абмене тэрыторыі некаторых астравоў у Фінскім заліве, а таксама часткі паўвостраваў Рыбачы і Сярэдні на двайную па размерах тэрыторыю ў Совецкай Карэліі, як відаць, не сустракаюць супярэчнасцей з боку фінляндскага ўрада. Рознагалоссі ў адносінах некаторых нашых прапаноў яшчэ не пераадолены, а зробленыя ў гэтых адносінах Фінляндыяй уступкі, напрыклад, частковая ўступка тэрыторыі на Карэльскім перашэйку, яўна не дасягаюць мэты.

Мы зрабілі, далей, рад новых крокаў насустрач Фінляндыі. Мы сказалі, што, калі будуць прыняты нашы асноўныя прапановы, мы гатовы зняць нашы пярэчанні супроць ўзбраення Аландскіх астравоў, на чым ужо даўно настойвае Фінляндскі ўрад. Мы агаварылі толькі, што мы знімаем свае пярэчанні супроць узбраення Аландскіх астравоў пры ўмове, што ўказаныя ўзбраенні будуць праводзіцца нацыянальнымі сіламі самой Фінляндыі і што ў гэтых узбраеннях трэція краіны не будуць прымаць ніякага ўдзелу, паколькі і СССР не ўдзельнічае ў іх. Мы прапанавалі таксама Фінляндыі правесці на ўсёй совецка-фінскай граніцы па Карэльскім перашэйку разбраенне ўмацаваных раёнаў, што павінна цалкам адпавядаць інтарэсам Фінляндыі. Мы выразілі, далей, жаданне ўзмацніць совецка-фінскі пакт ненападу дадатковымі ўзаемнымі гарантыямі. Нарэшце, умацаванне палітычных совецка-фінскіх адносін, несумненна, з'явілася-б выдатнай базай і для быстрага пад'ёму гаспадарчых адносін паміж нашымі краінамі.

Такім чынам, мы гатовы ісці насустрач Фінляндыі ў тых пытаннях, у якіх яна асабліва зацікаўлена.

Пасля ўсяго гэтага мы не думаем, каб з боку Фінляндыі сталі шукаць повады да зрыву мяркуемага пагаднення. Гэта не адпавядала-б палітыцы дружаскіх совецка-фінскіх адносін і, вядома, нанесла-б сур'ёзную шкоду Фінляндыі.

Мы ўпэўнены, што кіруючымі фінляндскімі кругамі будзе правільна зразумета значэнне ўмацавання совецка-фінскіх дружаскіх адносін, і фінляндскія дзеячы не паддадуцца якому-небудзь антысовецкаму даўленню і падбухторванню з боку каго-б то ні было.

Я павінен, аднак, паведаміць, што нават прэзідэнт Злучаных Штатаў Амерыкі знайшоў умесным умяшацца ў гэтыя пытанні, што цяжка ўзгадніць з палітыкай амерыканскага нейтралітэта. У сваім пасланні 12 кастрычніка на імя т. Калініна — Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета, п. Рузвельт выразіў надзею на захаванне і развіццё дружалюбных і мірных адносін паміж СССР і Фінляндыяй. Можна падумаць, што ў Злучаных Штатаў Амерыкі лепш абстаяць справы, скажам, з Філіпінамі або з Кубай, якія даўно патрабуюць ад ЗША свабоды і незалежнасці, і не могуць іх атрымаць, чым у Совецкага Саюза з Фінляндыяй, якая даўно ўжо атрымала ад Совецкага Саюза і свабоду і дзяржаўную незалежнасць.

На пасланне п. Рузвельта т. Калінін адказаў наступным чынам:

«Лічу ўмесным напомніць Вам, пан прэзідэнт, што дзяржаўная незалежнасць Фінляндскай рэспублікі была прызнана свабодным волевыяўленнем совецкага ўрада 31 снежня 1917 года, і што суверэнітэт Фінляндыі забяспечан за ёю мірным дагаворам паміж РСФСР і Фінляндыяй ад 14 кастрычніка 1920 года. Указанымі актамі совецкага ўрада вызначаны былі асноўныя прынцыпы ўзаемаадносін паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй. У адпаведнасці з гэтымі прынцыпамі вядуцца і цяперашнія перагаворы паміж совецкім урадам і ўрадам Фінляндыі. Наперакор тэндэнцыйным версіям, распаўсюджваемым кругамі, відавочна, не зацікаўленымі ў еўрапейскім міры, адзінай мэтай указаных перагавораў з'яўляецца ўмацаванне ўзаемаадносін паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй і ўмацаванне дружаственага супрацоўніцтва абодвух краін ў справе забеспячэння безапаснасці Совецкага Саюза і Фінляндыі».

Пасля такога яснага адказу Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР павінна быць зусім зразумела, што пры наяўнасці добрай волі, фінляндскі ўрад пойдзе насустрач нашым мінімальным прапановам, якія не толькі не супярэчаць нацыянальным і дзяржаўным інтарэсам Фінляндыі, але ўмацоўваюць яе знешнюю безапаснасць і ствараюць шырокую базу для далейшага шырокага развіцця палітычных і гаспадарчых адносін паміж нашымі краінамі.

Некалькі слоў аб перагаворах з **Турцыяй.**

Аб сутнасці гэтых перагавораў пішуць за граніцай усякую небыліцу. Адны сцвярджаюць, што СССР нібы патрабаваў перадачы раёнаў Ардагана і Карса. Скажам ад сябе, што гэта — суцэльны вымысел і хлусня. Іншыя сцвярджаюць, што СССР патрабаваў нібы змянення міжнародный канвенцыі, заключанай у Монтры, і пераважных правоў для СССР у пытанні аб праліваx. Гэта — таксама вымысел і хлусня. На самой справе гутарка ішла аб заключэнні двухбаковага пакта ўзаемадапамогі, абмежаванага раёнамі Чорнага мора і праліваў. СССР лічыў, што заключэнне такога пакта не можа пабудзіць яго да дзеянняў, якія маглі-б упягнуць яго ва ўзбраены канфлікт з Германіяй, гэта па-першае, і што СССР павінен мець гарантыю, што з прычыны пагрозы вайны Турцыя не прапусціць ваенных караблёў нечорнаморскіх дзяржаў праз Басфор у Чорнае мора, гэта па-другое, Турцыя адхіліла абедзве гэтыя агаворкі СССР і тым зрабіла немагчымым заключэнне пакта.

Совецка-турэцкія перагаворы не прывялі да заключэння пакта, але яны дапамаглі выясніць або, па крайняй меры, прашчупаць рад цікавячых нас палітычных пытанняў. У сучаснай міжнароднай абстаноўцы асабліва важна ведаць сапраўдны твар і палітыку дзяржаў, адносіны з якімі маюць сур'ёзнае значэнне. У палітыцы Турцыі нам многае стала цяпер куды ясней, як у рэзультаце маскоўскіх перагавораў, так і ў рэзультаце апошніх знешне-палітычных актаў турэцкага ўрада.

Як вядома, урад Турцыі палічыў за лепшае звязаць свой лёс з пэўнай групіроўкай еўрапейскіх дзяржаў, прымаючых удзел у вайне. Ён заключыў пакт узаемадапамогі з Англіяй і Францыяй, якія ўжо два месяцы вядуць вайну супроць Германіі. Тым самым Турцыя канчаткова адкінула асцярожную палітыку нейтралітэта і ўступіла ў арбіту разгортваючайся еўрапейскай вайны. Гэтым вельмі задаволены як у Англіі, так і ва Францыі, якія хочуць паболыи нейтральных краін упягнуць у сваю сферу вайны. Ці не пашкадуе аб гэтым Турцыя — гадаць не будзем. **(Ажыўленне ў зале).** Нам прыходзіцца толькі адзначыць гэтыя новыя моманты ў знешняй палітыцы нашага суседа і ўважліва сачыць за развіццём падзей.

Калі Турцыя да пэўнай ступені цяпер звязала сабе рукі і схілілася да рыскованай для яе палтрымкі адной з ваюючых краін, то, відавочна, турэцкі ўрад сазнае адказнасць, якую ён гэтым узяў на сябе. Але гэта не тая знешняя палітыка, якой следуе Совецкі Саюз і дзякуючы якой Совецкі Саюз ужо забяспечыў не мала знешне-палітычных поспехаў. Совецкі Саюз лічыць за лепшае і надалей пакінуць сабе рукі свабоднымі, паслядоўна праводзіць сваю палітыку нейтралітэта і не толькі не садзейнічаць распальванню вайны, а садзейнічаць умацаванню наяўных імкненняў да аднаўлення міру. Мы ўпэўнены ў тым, што палітыка міру, якую няўхільна праводзіць СССР, мае і ў далейшым лепшыя перспектывы. Гэтую палітыку мы будзем праводзіць і ў раёне Чорнага мора з упэўненасцю, што поўнасцю забяспечым належнае яе правядзенне, як гэтага патрабуюць інтарэсы Совецкага Саюза і дружаственых яму дзяржаў. **(Апладысменты).**

Цяпер аб адносінах з **Японіяй.**

За апошні час у совецка-японскіх адносінах ёсць вядомае паляпшэнне. Гэтае паляпшэнне намецілася з часу нядаўняга маскоўскага пагаднення, у рэзультаце якога быў ліквідаван вядомы канфлікт на Мангола-манчжурскай граніцы.

На працягу раду месяцаў, дакладней гаворачы на працягу мая, чэрвеня, ліпеня, жніўня і да сярэдзіны верасня, у Номанханскім раёне, прымыкаючым да мангола-манчжурскай граніцы, адбываліся ваенныя дзеянні з удзелам японска-манчжурскіх і совецка-мангольскіх войск. У баявых дзеяннях за гэты перыяд удзельнічалі ўсе роды зброі, уключаючы авіяцыю і цяжкую артылерыю, а бай часамі прымалі вельмі кровепралітны характар. Нікому непатрэбны канфлікт выклікаў нямалыя афіры на нашай старане, але гэтыя афіры былі ў некалькі разоў больш на японска-манчжурскай старане. Нарэшце, Японія звярнулася да нас з прапановай ліквідаваць канфлікт, і мы ахвотна пайшлі насустрач японскаму ўраду.

Як вядома, канфлікт быў выклікан імкненнем Японіі прысвоіць частку тэрыторыі Мангольскай Народнай Рэспублікі і гэтым шляхам насільствена змяніць у сваю карысць мангола-манчжурскую граніцу. Такі аднабаковы метад павінен быў сустрэць рашучы адпор і паказаў яшчэ раз сваю поўную несастаяцельнасць, калі справа датычыць Совецкага Саюза або яго саюзнікаў. Калі на злапалучным прыкладзе Польшчы было нядаўна прадэманстрыравана, як танна іншы раз каштуюць пакты ўзаемадапамогі, падпісаныя некаторымі вялікімі дзяржавамі Еўропы **(смех),** то на мангола-манчжурскай граніцы было прадэманстрыравана зусім інтэрэсна, як трывалы і моцны пакт, заключаны СССР з Манголіяй. Тут было прадэманстрыравана значэнне пактаў узаемадапамогі, пад якімі стаіць подпіс Совецкага Саюза **(Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты).**

Што датычыць ўказанага канфлікта, то ў рэзультаце совецка-японскага пагаднення, заключанага 15 верасня ў Маскве, ён быў ліквідаван і мір быў поўнасцю адноўлен на мангола-манчжурскай граніцы. Тым самым быў зроблен першы крок да паляпшэння совецка-японскіх адносін.

На чарзе стаіць стварэнне змешанай пагранічнай камісіі з прадстаўнікоў совецка-мангольскай і японска-манчжурскай старон. Гэтай камісіі прадстаіць разглядзець некаторыя спрэчныя пагранічныя пытанні. Можна не сумняваціа, што калі добрая воля будзе праяўлена не толькі з нашага боку, то метад дзелавога разгляду пагранічных пытанняў дасць станоўчыя рэзультаты.

Апрача таго, выяснілася магчымасць прыступіць да перагавораў па пытаннях совецка-японскага гандлю. Нельга не прызнаць, што развіццё совецка-японскага тавараабароту адпавядае інтарэсам абодвых дзяржаў.

Такім чынам, мы маем падставы гаварыць аб намеціўшымся паляпшэнні нашых адносін з Японіяй. Зараз цяжка меркаваць, у якой меры можна разлічваць на быстрае развіццё гэтай тэндэнцыі. Нам яшчэ не ўдалося выясніць, наколькі сур'ёзна падрыхтавана глеба для гэтага ў японскіх кругах. Са свайго боку павінен сказаць, што мы станоўча адносімся да гэтага роду японскіх прапаноў, палыходзячы да іх з пункту гледжання асноўнай нашай палітычнай пазіцыі і клопатаў аб інтарэсах міру.

Нарэшце, некалькі слоў аб ваеннай кантрабандзе і аб вывазе зброі з нейтральных краін у ваюючыя краіны.

Гэтымі днямі была апублікавана нота совецкага ўрада ў адказ на ноты Англіі ад 6 і 11 верасня. У нашай ноце ізложан пункт гледжання СССР на пытанні ваеннай кантрабанды і ўказана, што совецкі ўрад не можа прылічыць да ваеннай кантрабанды прадукты харчавання, паліва для мірнага насельніцтва і прадметы адзення, што забараніць увоз прадметаў масавага спажывання — значыць, асудзіць дзяцей, жанчын, старыкоў, хворых, на бедствы і галодную смерць. Совецкі ўрад указвае ў ноце, што такія пытанні не могуць быць прадметам аднабаковага рашэння, як зрабіла гэта Англія, а павінны быць вырашаны з агульнай згоды дзяржаў. Мы разлічваем, што нейтральныя краіны, а таксама грамадская думка Англіі і Францыі прызнаюць правільнасць нашай пазіцыі і прымуць меры к таму, каб вайна паміж арміямі ваюючых краін не была ператворана ў вайну супроць дзяцей, жанчын, старыкоў, хворых, Ва ўсякім выпадку наша краіна, як краіна нейтральная, не зацікаўленая ў распальванні вайны, прыме ўсе меры, да таго, каб зрабіць вайну менш разбуральнай, аслабіць яе і паскорыць яе сканчэнне ў інтарэсах міру.

З пункту гледжання такой перспектывы рашэнне амерыканскага ўрада аб адмене забароны (эмбарго) на вываз зброі ў ваюючыя краіны выклікае законныя сумненні. Наўрад-ці можа быць сумненне, што гэта рашэнне будзе мець сваім рэзультатам не аслабленне вайны і не набліжэнне канца вайны, а наадварот — узмацненне, абвастрэнне і зацяжку вайны. Вядома, такое рашэнне можа забяспечыць высокія барышы для амерыканскай ваеннай прамысловасці. Але вось пытанне: ці можа гэта акалічнасць служыць апраўданнем адмены эмбарго на вываз зброі з Амерыкі? Ясна, што не можа.

Такая міжнародная абстаноўка ў цяперашні час.

Такія асновы знешняй палітыкі Совецкага Саюза.

(Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю, усе дэпутаты ўстаюць).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
АБ СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА І СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

31 КАСТРЫЧНІКА 1939 года

31 кастрычніка, у 7 гадзін 30 мінут вечара, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося адкрыццё Унечарговай Пятай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР 1-га склікання.

Старшынствуе — Старшыня Совета Саюза дэпутат **Андрэеў А. А.**

Перад адкрыццём Сесіі па прапанове таварыша **Андрэева А. А.** Вярхоўны Совет СССР ушанаваў уставаннем памяць нашых воінаў, паўшых на тэрыторыі Польшчы пры вызваленні народаў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад рабства капіталізма.

Затым таварыш **Андрэеў** аб'яўляе Унечарговую Пятую Сесію Вярхоўнага Совета СССР адкрытай і агалашае пералік пытанняў, унесеных на разгляд Вярхоўнага Совета СССР.

Таварыш **Андрэеў А. А.** паведамляе аб тым, што ў Маскву прыбылі і прысутнічаюць на Сесіі Вярхоўнага Совета СССР поўнамоцныя камісіі Народных Сабранняў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Ад імені дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР тав. Андрэеў, пад бурныя апладысменты і воклічы «ура», вітае членаў поўнамоцных камісій Народных Сабранняў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі і ў іх асобе — брацкія народы Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, вызваленыя ад гнёту польскіх паноў і капіталістаў нашай доблеснай Чырвонай Арміяй.

Дэпутат **Бакрадзе В. М.** прапануе ўключыць унесеныя на разгляд Вярхоўнага Совета СССР пытанні ў паралак дня Унечарговай Пятай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

Раздзельным галасаваннем па палатах Вярхоўны Совет СССР адногалосна зацвярджае наступны парадак дня:

1. Аб знешняй палітыцы ўрада Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік.
2. Заява поўнамоцнай камісіі Народнага Сабрання Заходняй Украіны.
3. Заява поўнамоцнай камісіі Народнага Сабрання Заходняй Беларусі.

Па прапанове дэпутата **Бурмістэнка М. А.** Вярхоўны Совет СССР, раздзельным галасаваннем па палатах, прымае пастанову — усе пытанні прынятага парадку дня Унечарговай Пятай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР заслухаць і абмеркаваць на сумесных пасяджэннях Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

Пасля гэтага Вярхоўны Совет СССР пераходзіць да разгляду пункта першага паралку дня Сесіі.

З дакладам аб знешняй палітыцы ўрада выступіў сустрэнуты працяглай бурнай авацыяй Старшыня Совета Народных Камісараў СССР і Народны Камісар Замежных Спраў таварыш **Молатаў В. М.**

Па сканчэнні даклада тав. Молатава дэпутат **Кузнецоў А. А.** уносіць прапанову: з прычыны вычарпальнай яснасці і паслядоўнасці знешняй палітыкі ўрада СССР — спрэчак па дакладу Старшыні Совета Народных Камісараў СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. Молатава не адкрываць. Вярхоўны Совет СССР аднагалосна прымае гэту прапанову.

Затым па прапанове дэпутата **Кузнецова** Вярхоўны Совет СССР, раздзельным галасаваннем па палатах, аднагалосна прымае наступную пастанову:

«Вярхоўны Совет Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік, заслухаўшы даклад Старшыні Совета Народных Камісараў СССР і Народнага Камісара Замежных Спраў тав. **Молатава** Вячэслава Міхайлавіча аб знешняй палітыцы ўрада, **пастанаўляе:**

Адобрыць знешнюю палітыку ўрада».

На гэтым першае сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей закрываецца.

Аб пасяджэнні Унечарговай Пятай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР

1 лістапада, у 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбудзецца сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

На парадку дня: заява поўнамоцнай камісіі Народнага Сабрання Заходняй Украіны.

ПРАДСТАЎНІКІ ПРАЦОЎНЫХ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў МАСКВЕ

СУСТРЭЧА НА ПЛОШЧЫ БЕЛАРУСКАГА ВАКЗАЛА

31 кастрычніка яшчэ з раніцы Маскву абляцела вестка: прыязджае паўнамоцная камісія Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Масквічы з нецярпеннем чакалі сустрэчы з прадстаўнікамі вызваленага брацкага народа.

Вуліцы, прылягаючыя да Беларускага вакзала, упрыгожыліся святочным нарадам. На франтоне вакзала — партрэты Леніна і Сталіна, кіраўнікоў партыі і ўрада, прывітальныя лозунгі. Перон усланы шырокай каўровай дарожкай, усюды кветкі. Паміж калонамі працягнуты чырвоныя ленты, на якіх начартаны па-беларуску словы прывітання:

— Няхай жыве вызвалены шчаслівы народ Заходняй Беларусі!

Сярод сустракаючых — Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР тав. А. Ф. Горкін, Старшыня Моссовета тав. В. П. Пронін, Сакратар МК ВКП(б) т. Б. Н. Чэрнаусаў, сакратары МГК ВКП(б) тт. Г. М. Папоў і В. Е. Макараў. Прышлі Героі Совецкага Саюза тт. Папанін, Спірын, Грызадубава, Раскова, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый сталіцы. Прадстаўнікі заводаў імені Авіяхіма і імені Менжынскага з'явіліся з вялікімі букетамі кветак.

Прывакзальная плошча ад краю да краю поўна народу. Сабралася звыш 10 тысяч чалавек. З радыёрупараў гучаць мелодыі рускіх і беларускіх народных песень. На пероне выстраіўся пачотны караул.

Роўна ў 3 гадзіны дня поезд падыходзіць да дэбаркадэра. Грыміць «Сустрэчны марш». Сустракаючыя спяшаюцца да вагонаў. Госці выходзяць на перон. Дружаскія прывітанні, воклічы «ура».

Разам з паўнамоцнай камісіяй у Маскву прыбылі Сакратар ЦК КП(б) Беларусі тав. П. К. Панамарэнка і Камандарм 2-ранга тав. М. П. Кавалёў.

Пад прывітальныя воклічы прадстаўнікі працоўных Заходняй Беларусі накіроўваюцца да выхаду. Уперадзе — селяніны Гродненскага павета, дэпутат Народнага Сабрання Сямён Пятровіч Белюці. Начальнік пачотнага караула капітан тав. Данілаў аддае яму рапарт. Затым пачотны караул прахоўзіць міма гасцей пэрэманіяльным маршам. Раздаюцца воклічы «ура» у чэсць доблеснай Чырвонай Арміі, у чэсць яе правадыра таварыша Варашылава, у чэсць вялікага друга вызваленага народа таварыша Сталіна.

На прывакзальнай плошчы адбыўся ўрачысты мітынг.

ДЭКЛАРАЦЫЯ
НАРОДНАГА САБРАННЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ АБ КАНФІСКАЦЫІ ПАМЕШЧЫЦКІХ ЗЯМЕЛЬ

Прынята аднагалосна на пасяджэнні 30 кастрычніка 1939 года.

Працоўныя Заходняй Беларусі пры дапамозе вялікага совецкага народа дабіліся свайго вызвалення і назаўсёды пазбавіліся ад панавання памешчыкаў і капіталістаў. Створаныя па ініцыятыве сялян — беднякоў, сераднякоў сялянскія камітэты ўзначалілі барацьбу сялян за захват памешчыцкіх зямель, зямель манастыроў і буйных дзяржаўных чыноўнікаў і перадачу іх у карыстанне працоўных сялян.

Знішчэнне памешчыцкага землеўладання і ліквідацыя на гэтай аснове беззямелля і малазямелля найшырэйшых мас сялянства азначае, што сялянскаму голаду і жабрацтву, гэтым пастаянным спадарожнікам палітычнага і эканамічнага панавання памешчыкаў і капіталістаў, пакладзен канец.

Беларускае Народнае Сабранне, кіруючыся кроўнымі інтарэсамі працоўных сялян і выражаючы волю ўсіх працоўных мас, абвяшчае на тэрыторыі Заходняй Беларусі канфіскацыю без усякага выкупу памешчыцкіх зямель, зямель манастыроў, зямель буйных дзяржаўных чыноўнікаў з усім іх жывым і мёртвым інвентаром і прысядзібнымі пабудовамі.

Ад гэтага часу ўся зямля Заходняй Беларусі з яе нетрамі, а таксама лясы і воды аб'яўляюцца агульнанародным здабыткам, г. зн. дзяржаўнай уласнасцю.

Беларускае Народнае Сабранне зацвярджае праведзенае сялянскімі камітэтамі адабранне памешчыцкіх зямель і перадачу іх у карыстанне працоўных сялян.

Беларускае Народнае Сабранне заклікае працоўнае сялянства да найстражэйшай аховы былых памешчыцкіх маёнткаў, пабудоў, інвентара і лясоў, якія з'яўляюцца цяпер уласнасцю народа, ад папсуцця і раскрадання.

Памешчыцкай зямлёй і маёмасцю могуць распараджацца толькі сялянскія камітэты.

Зямлёй павінен карыстацца толькі той, хто працуе на ёй, хто сам апрацоўвае зямлю.

Няхай жыве працоўны народ Заходняй Беларусі, адзіны законны гаспадар усёй зямлі!

Няхай жыве саюз рабочых і сялян!

ДЭКЛАРАЦЫЯ
НАРОДНАГА САБРАННЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ АБ НАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ БАНКАЎ І БУЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Прынята аднагалосна на пасяджэнні 30 кастрычніка 1939 года

Вызвалены ад улады памешчыкаў і капіталістаў народ Заходняй Беларусі на сваіх мітынгах і сходах паставіў пытанне аб неабходнасці нацыяналізацыі банкаў і буйных прадпрыемстваў.

Банкі ў руках польскіх магнатаў, памешчыкаў і капіталістаў служылі для таго, каб умацоўваць панаванне эксплаататараў, даваць ім нажывацца за кошт працы рабочых і сялян. Яны дапамагалі перакачваць народныя сродкі ў кішэні капіталістаў, памешчыкаў і спекулянтаў.

Фабрыканты і заводчыкі бесчалавечна эксплаатыравалі рабочых, разаралі рамеснікаў, выкачвалі за бясцэнак сыравіну ў сялян Заходняй Беларусі. Нажываючы велізарныя багацці, фабрыканты і заводчыкі трымалі ў кабале і жабрацтве рабочы клас. Беспрацоўе і звязаныя з ім незабяспечанасць і няўпэўненасць у заўтрашнім дні з'яўляліся пастаянным лёсам рабочых Заходняй Беларусі.

У мэтах знішчэння эксплаатацыі чалавека чалавекам і пазбаўлення паразітаў — фабрыкантаў, заводчыкаў і банкіраў іх улады над працоўным народам, Беларускае Народнае Сабранне абвяшчае нацыяналізацыю банкаў і буйнай прамысловасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Ад гэтага часу банкі з іх каштоўнасцямі, усе буйныя прамысловыя прадпрыемствы, руднікі і чыгункі аб'яўляюцца ўсенародным здабыткам, г. зн. дзяржаўнай уласнасцю.

Ад гэтага часу працоўныя Заходняй Беларусі атрымліваюць у свае рукі магутны сродак свайго эканамічнага вызвалення — банкі і буйную прамысловасць. Тым самым створаны ўмовы для ўздыму народнай гаспадаркі, які будзе забяспечан свабоднай працай рабочых, што становяцца цяпер гаспадарамі фабрык і заводаў.

Беларускае Народнае Сабранне заклікае ўсіх рабочых і служачых да рэволюцыйнай дысцыпліны і самаадданай працы ў інтарэсах канчатковай перамогі новага ладу.

НАРОДНАЕ САБРАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ таварышу В. М. МОЛАТАВУ

У гістарычныя дні работы Народнага (нацыянальнага) Сабрання мы, выбраннікі народа, шлем Вам, саратніку вялікага Сталіна, наша гарачае прывітанне.

Доўгія годы марнеў народ Заходняй Беларусі пад ярмом польскіх паноў, ператварыўшых нашу краіну ў калонію польскай дзяржавы. Капіталісты і памешчыкі, ксяндзы і чыноўнікі грабілі наш багаты край, высмоктвалі апошнія сокі з працоўнага народа, агнём і мечам знішчаючы малейшае праяўленне пратэста.

Але гонды, свабодалюбівы беларускі народ ніколі не схіляў сваю галаву перад прыгнятальнікамі. Ён, падобна Праметэю, скованы ланцугамі, ірваўся ўперад, да перамогі, да шчасця. Накіроўваючы свой погляд на ўсход, ён з надзеяй чакаў дня, калі і над яго зямлёй заззяе яркае сонца краіны Совецтаў.

Гэты дзень прышоў, і мы яго ніколі не забудзем. Мы не забудзем дапамогі, аказанай нам Совецкай краінай, краінай, якая нясе шчасце і прагрэс чалавецтву. Вечна, ад пакалення да пакалення, будзе пераходзіць гарачая ўдзячнасць вялікаму совецкаму народу, яго гераічнай Чырвонай Арміі, яго правадырам.

З дапамогаю Совецкага Саюза наш народ вызваліўся ад сваіх прыгнятальнікаў і пачаў будаваць новае жыццё. Сяляне атрымалі зямлю, рабочыя атрымалі магчымасць свабодна працаваць, тысячы людзей ужо атрымалі работу.

З дапамогай вялікай Совецкай краіны мы выйшлі на шырокую дарогу, якая вядзе ў свет, дзе няма нацыянальнай розні, дзе не пануе звярыны закон капіталізма: «чалавек чалавеку воўк», дзе пануюць узаемнае давер'е і дружба народаў, дружба ўсіх працоўных.

Вось чаму, выбіраючы нас, народ Заходняй Беларусі даў нам наказ галасаваць за совецкую ўладу, за далучэнне Заходняй Беларусі да вялікага Совецкага Саюза.

Мы памяталі наказы нашых выбаршчыкаў і аднадушна вырашылі ўсе стаячыя перад намі пытанні так, каб выканаць мары і жаданні нашага народа.

Няхай жыве вялікі і магутны Совецкі Саюз!

Няхай жыве совецкая ўлада — улада працоўнага народа!

Няхай жыве Рабоча-Сялянскі совецкі ўрад і яго глава Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў!

Жадаем Вам, дарагі Вячэслаў Міхайлавіч, яшчэ доўгія годы жыцця і барацьбы на карысць народа, на карысць чалавецтва.

Няхай жыве вялікі правадыр і друг працоўных усяго свету — Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

НАРОДНАЕ САБРАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ таварышу К. Е. ВАРАШЫЛАВУ

Дарагі Клімент Ефрэмавіч!

У гэтыя ўрачыстыя дні, калі Народнае Сабранне воляй вызваленага народа Заходняй Беларусі вырашае гістарычныя справы, мы ад імені вызваленага народа Заходняй Беларусі шлем Вам, і ў Вашай асобе ўсёй магутнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, якая вызваліла нашу зямлю ад праклятага ярма польскіх памешчыкаў і капіталістаў, словы прывітання, любві і ўдзячнасці.

20 год мы не бачылі яснага дня. Мы жылі пад страхам паліцэйскага бізуна і свавольства, плакалі горкімі слязьмі старыкі, жанчыны і дзеці. Мы не мелі права на жыццё. Лепшыя людзі, якія змагаліся за народ, гнаіліся ў турмах і канцлагерах.

Армія, пасланая вялікім совецкім народам, назаўсёды прагнала з нашай зямлі польскіх генералаў і памешчыкаў. Яна прынесла нам вызваленне. Наш народ наўчна пераканаўся ў сіле і непераможнасці гэтай арміі.

Радасныя і шчаслівыя, з неперадаваемым захапленнем, сустракалі мы сваіх братоў-чырвонаармейцаў.

З іменем вялікага Сталіна выконвалі чырвоныя палкі цад Вашым, Клімент Ефрэмавіч, валізцельствам сваю гістарычную вызваленчую місію.

З іменем Сталіна на вуснах і ў сэрцах сустракалі сваіх вызваліцеляў народы Заходняй Беларусі.

Вось чаму над вызваленымі абшарамі Заходняй Беларусі, як спят, як сімвал свабоды, нясецца з края ў край:

«Няхай жыве наш родны Сталін! Няхай жыве першы маршал арміі соцыялізма — таварыш Варашылаў!».

Чырвоная Армія, якая самааддана выканала наказ совецкага народа, паказала, што яна не толькі ўмее біць ворагаў, але ўмее і будаваць новае жыццё.

Зараз, калі ў вызваленай краіне ідзе бурная творчая работа, кожны баец Чырвонай Арміі з'яўляецца актыўным удзельнікам гэтага творчага працэса. Ён — палкі агітатар, носьбіт сталінскай праўды, высокай культуры, стваральнік новага жыцця.

Пройдуць годы, але вечна ў памяці народаў Заходняй Беларусі будуць жыць незабыўныя верасеньскія дні 1939 года, дні пазбаўлення ад праклятага панскага іга, дні доўгачаканай сустрэчы з гераічнай Чырвонай Арміяй, сталінскай арміяй-вызваліцельніцай, як па праву называюць яе працоўныя Заходняй Беларусі.

Дарагі Клімент Ефрэмавіч! Прыміце ад нас нашу прызнацельнасць і вялікае дзякуй.

Няхай жыве Чырвоная Армія і яе правадыр таварыш Варашылаў!

Няхай жыве натхніцель вялікіх перамог, творац чалавечага шчасця, наш родны і любімы Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

ПРАЦОЎНЫЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ АДНАДУШНА ВІТАЮЦЬ УСТАНАЎЛЕННЕ СОВЕЦКАЙ УЛАДЫ

Дэпутат Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, урач Гродненскай больніцы Е. Э. Бутэньскі прымае хворых рабочых табачнай фабрыкі. НА ЗДЫМКУ: Е. Э. Бутэньскі (справа) гутарыць з хворай работніцай Н. А. Шчыгле ўскай.

Фото І. Шышко. (Фотахроніка БЕЛТА).

* * *

Я СТАЎ ГРАМАДЗЯНІНАМ ВЯЛІКАГА СОВЕЦКАГА САЮЗА

Вясёлае, радаснае жыццё наступіла для мяне і маіх дзяцей Прайшлі праклятыя годы пакут. Больш дваццаці год я пражыў пад ігам польскіх паноў. Гэтыя годы пражыты, як у турме. Крыважэрныя паны не адзін раз скоўвалі мае рукі, здзекваліся з мяне і маіх дзяцей.

З 1922 па 1923 г. мяне праследвала паліцыя, не давала праходу. Прышлося пасядзець тры з палавінай месяцы ў турме. Пасля гэтага я сваю рэволюцыйную дзейнасць не спыняў. Працаваў з сялянскімі масамі, растлумачваў ім што ёсць краіна, дзе працоўныя жывуць радасна і шчасліва, дзе няма эксплаататараў, памешчыкаў, дзе рабочыя і сяляне з'яўляюцца гаспадарамі свайго лёсу.

Польскія ішчэйкі даведаліся аб маёй рабоце. У 1927 годзе мяне зноў арыштавалі, пасадзілі ў турму. Сядзеў я 8 месяцаў; за гэты час я пабываў у Вілейскай, Віленскай і іншых турмах. Са мной у турме былі і мае таварышы; многіх з іх закатавалі, а некаторыя вярнуліся дамоў ледзь жывымі. Гэта таварышы Барэр, Корсак, Штэйнберг.

Дваццаць год польскія паны здзекваліся над намі, працоўнымі сялянамі, асуджалі нас на гібель і выміранне. Увесь час нашы позіркі былі накіраваны на ўсход, дзе свецяцца крэмлёўскія зоркі, дзе квітнее і пышна расце жыццё, шчаслівае жыццё працоўных вялікага Совецкага Саюза.

Наша мара збылася. 17 верасня доблесная Чырвоная Армія дапамагла нам вызваліцца ад векавечнай панскай кабалы, забяспечыла нам шчаслівае і радаснае жыццё.

30 кастрычніка, я даведаўся аб сканчэнні работы Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Як і ўвесь народ, я вельмі рад і ўдзячан за гэтыя сапраўды гістарычныя народныя рашэнні

Народнае Сабранне выканала нашу волю. Яно запісала ў сваім гістарычным рашэнні, што Заходняя Беларусь далучаецца да вялікага Совецкага Саюза, да Беларускай Совецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. На тэрыторыі Заходняй Беларусі ўстаноўлена совецкая ўлада, улада радасці і шчасця.

30 кастрычніка 1939 года я стаў грамадзянінам вялікага Совецкага Саюза.

Совецкі Саюз — наша любімая радзіма, якую я і мая сям'я будзем абараняць, не шкадуючы жыцця.

Зараз над намі засвяціла сонца Сталінскай Канстытуцыі, Канстытуцыі свабоды і роўнапраўя.

Няхай жыве совецкая ўлада!

Няхай жыве наш правадыр, наш родны, вялікі Сталін!

Сямён КОЗЕЛЬ.

Вёска Орсэн Вілейскага павета.

Дэпутат Народнага Сабрання Заходняй Беларусі ад 5 выбарчай акругі гор. Гродна рабочы піваваранага завода Н. З. Шахтмейстэр гутарыць з рабочымі.

Фото І. Шышко. (Фотахроніка БЕЛТА).

НАРОДНАЕ САБРАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Заключнае пасяджэнне 30 кастрычніка 1939 года

БЕЛАСТОК, 31 кастрычніка. (БЕЛТА). 30 кастрычніка раніцою адбылося заключнае пасяджэнне Народнага Сабрання Заходняй Беларусі Абмяркоўваўся даклад аб нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці.

Дэпутат Верхавец у сваім выступленні прыводзіць патрасаючыя факты закабалення сялян польскімі банкамі, жорсткай эксплаатацыі рабочых капіталістамі.

Ён прапануе нацыяналізаваць банкі і буйную прамысловасць і тым самым вызваліць рабочых і сялян ад памешчыцка-капіталістычнага ярма. Аб гэтым-жа ў сваіх выступленнях гаворыць дэпутаты Сегель, Ліўшыц, Тарасюк, Рэдзіх.

Па прапанове дэпутатаў спрэчкі па дакладу аб нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці спыняюцца.

Доўгімі авацыямі сустракае зала прапанову паслаць прывітанне Старшыні Совета Народных Камісараў таварышу Молатаву. Дэпутаты, стоячы, доўга апладыруюць. Па зале нясуцца воклічы: «Няхай жыве совецкі ўрад!», «Няхай жыве глава совецкага ўрада таварыш Молатаў!», «Няхай жыве таварыш Сталін!».

Затым слова для даклада мандатнай камісіі атрымлівае дэпутат І. Н. Карасеў. Ён паведамляе, што ў работах Народнага Сабрання прымаюць удзел 926 дэпутатаў; трое з іх не з'явіліся па ўважлівых прычынах. Сярод дэпутатаў — 563 селяніна, 197 рабочых, 29 служачых, 112 прадстаўнікоў інтэлігенцыі і 25 саматужнікаў.

У саставе Народнага Сабрання 621 беларус, 127 палякаў, 72 яўрэі, 43 рускіх, 53 украінцы, 10 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, у тым ліку літоўцы і татары. Гэтыя даныя дэманстрыруюць сапраўдны народны характар Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, сапраўды сталінскую дружбу народаў.

Паведамляючы, што ў былым польскім сейму засядалі 27 памешчыкаў, 41 фабрыкант, 43 буйныя чыноўнікі, 9 афіцэраў і генералаў, 11 ксяндзоў, папоў і равінаў, 64 ураднікі, дакладчык заявіў:

— У гэтай зале вы не знойдзеце ніводнага памешчыка, ніводнага фабрыканта, ніводнага банкіра, ніводнага паліцэйскага. Наша Народнае Сабранне — сабранне сапраўдных прадстаўнікоў народа.

Народнае Сабранне аднагалосна зацвярджае даклад мандатнай камісіі і пераходзіць да зацвярджэння дэкларацыі аб канфіскацыі ўсіх зямель памешчыкаў, манастыроў і буйных дзяржаўных чыноўнікаў.

Народнае Сабранне аднагалосна зацвярджае дэкларацыю аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель.

Дэпутат Церэх уносіць на зацвярджэнне Народнага Сабрання праект дэкларацыі аб нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці.

У зале ўспыхвае авацыя, нясуцца воклічы прывітанняў таварышу Сталіну, совецкаму ўраду.

Дэкларацыя аб нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці зацвярджаецца Народным Сабраннем аднагалосна.

На трыбуне дэпутат Л. П. Пятух. Яна прапануе паслаць прывітанне таварышу Варашылаву. У зале доўга грыміць «ура», дэпутаты агалашаюць здравіцу ў чэсць Наркома Абароны Совецкага Саюза, у чэсць гераічнай Чырвонай Арміі

Затым дэпутат Спасаў уносіць прапанову абвясціць дзень 17 верасня 1939 года днём усенароднага свята.

Народнае Сабранне аднадушна прымае рашэнне:

Народнае Сабранне дэпутатаў Заходняй Беларусі пастанаўляе: дзень 17 верасня 1939 года — дзень вызвалення працоўных Заходняй Беларусі ад гнёту польскіх паноў — абвясціць днём усенароднага свята.

Па прапанове дэпутата Царук прымаецца пастанова аб пабудове ў горадзе Беластоку помніка байцам Чырвонай Арміі, якія палі ў баях за вызваленне Заходняй Беларусі ад іга польскай шляхты.

Старшынствуючы дэпутат Калінін паведамляе, што ўсе пытанні, якія падлягалі разгляду Народнага Сабрання, вычарпаны і аб'яўляе Народнае Сабранне Заходняй Беларусі закрытым.

У зале доўга грымяць поўныя захаплення прывітанні Совецкаму Саюзу, Чырвонай Арміі, главе совецкага ўрада таварышу Молатаву, кіраўніку ўзброеных сіл краіны сацыялізма таварышу Варашылаву, любімаму правадыру народаў таварышу Сталіну

З натхненнем ўся зала спявае гімн перамогі — «Інтэрнацыянал».

У 11 гадзін 30 мінут Народнае Сабранне Заходняй Беларусі закончыла сваю гістарычную работу.

АДАБРАЮЦЬ РАШЭННІ НАРОДНАГА САБРАННЯ

БАРАНАВІЧЫ, 31 кастрычніка. (Па тэлефону). Больш 500 рабочых — металістаў і харчавікоў — сабраліся ў кінатэатры «Аполло» на мітынг, прысвечаны гістарычным рашэнням Народнага Сабрання Заходняй Беларусі.

З кароткай і змястоўнай прамовай, якая не раз прарывалася бурнымі апладысментамі ў чэсць совецкай улады, у чэсць таварыша Сталіна, выступіў тав. Шырко. Тав. Шырко зачытаў дэкларацыю Народнага Сабрання Заходняй Беларусі аб дзяржаўнай уладзе, дэкларацыю аб далучэнні тэрыторыі Заходняй Беларусі да вялікага Совецкага Саюза.

Пасля даклада першым выступіў рабочы-столяр Абрам Юдэлевіч. Ён гаварыў аб вялікім свяце працоўных, аб радасці і шчасці, якое перажывае вызвалены народ у сувязі з устанаўленнем совецкай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі і далучэння Заходняй Беларусі да вялікай неасяжнай сацыялістычнай радзімы — бацькаўшчыны працоўных усяго свету — СССР.

Выступіўшыя тав. Садоўскі (на яўрэйскай мове) і тав. Вачэнка (на беларускай мове) заявілі, што дэпутаты Народнага Сабрання выразілі волю ўсяго працоўнага народа Заходняй Беларусі.

У канцы мітынга аднагалосна была прынята рэзалюцыя, у якой адабраюцца рашэнні Народнага Сабрання аб устанаўленні на тэрыторыі Заходняй Беларусі совецкай улады і далучэнні да Совецкай Беларусі.

Вялікі мітынг адбыўся на кансервным заводзе «Крос-экспарт», дзе прысутнічала больш 300 чалавек. Рабочыя завода аднадушна адабраюць рашэнні Народнага Сабрання. На гэтым-жа мітынгу рабочыя пастанавілі ўзняць халайніцтва аб прысваенні заводу імя правадыра ўсяго працоўнага чалавецтва — вялікага Сталіна.

Больш 350 рабочых-будаўнікоў горада на мітынгу ў кінатэатры «Агніско» ў прынятай рэзалюцыі цалкам і поўнасцю адобрылі гістарычныя рашэнні Народнага Сабрання.

Ва ўсіх вёсках Баранавіцкага павета адбыліся таксама многалюдныя мітынгі. Сяляне вёскі Калдачэва Гарадзішчанскай воласці сабраліся на сход у былым панскім маёнтку Сяляне аднадушна заявілі, што дэпутаты Народнага Сабрання поўнасцю выразілі волю народа.

Такія-ж мітынгі адбыліся і ў іншых месцах. На мітынгу ў вёсцы Стайкі Вальнянскай воласці прысутнічала больш 500 сялян.

М. НІКАЛАЙЧАНКА.

СУСТРЭЧА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАРОДНАГА САБРАННЯ

30 кастрычніка спецыяльным поездам з Беластока ў Маскву выехала паўнамоцная камісія, выбраная Народным Сабраннем для перадачы Сесіі Вярхоўнага Совета СССР рашэння Народнага Сабрання аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў Саюз Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

31 кастрычніка ў 3 гадзіны ночы поезд з паўнамоцнай камісіяй Народнага Сабрання прыбыў у Мінск. Не гледзячы на позні час, для сустрэчы прадстаўнікоў народа Заходняй Беларусі сабралася некалькі тысяч працоўных Мінска На пероне адбыўся кароткі мітынг. З гарачай прамовай ад імені працоўных сталіцы Совецкай Беларусі выступіў стаханавец завода імені Кірава тав. Кантаровіч.

З адказным словам выступіла сялянка Беластоцкай вобласці К. А. Тарасюк. Яна ад шчырага сэрца вітае працоўных сталіцы ордэнаноснай Совецкай Беларусі і вялікі совецкі народ, выносіць шчырую падзяку доблеснай Чырвонай Арміі, совецкаму ўраду, бацьку і другу ўсіх працоўных вялікаму Сталіну за вызваленне ад панскага іга.

Пад воклічы: «Няхай жыве вялікі Сталін!», «Ура вялікаму Сталіну!», «Няхай жывуць народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны!», «Няхай жыве вялікая сталінская дружба народаў!» і пад гукі аркестра і песні поезд адышоў на Маскву. (БЕЛТА).

НАД ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУССЮ ПАЛЫХАЕ СЦЯГ СОВЕТАЎ

ПІНСК, 31 кастрычніка. (Па тэлефону). Яшчэ вечарам 29 кастрычніка быстра, як маланка, горад абляцела вестка, што Народнае Сабранне прыняла дэкларацыю аб дзяржаўнай уладзе ў Заходняй Беларусі. Народ перажывае вялікае гаражство. На вуліцах, у клубах, рэстаранах, кіно і тэатрах — усе гаворыць аб незабыўнай падзеі ў жыцці вызваленага народа.

Няма больш двух тэрыторый у Беларусі, якая 20 год была рассечана і штучна разбіта несправядлівай граніцай. Ёсць адна зямля, адзін народ, адна свабодная Совецкая Беларусь. Вось чаму так рады працоўныя, што іх воля выканана, іх жаданні, вечная мара ажыццёўлены. Совецкая ўлада ўстаноўлена на вызваленай зямлі.

Увесь дзень 30 кастрычніка на прадпрыемствах, ва ўстановах праходзілі мітынгі працоўных.

Роўна ў 5 гадзін дня на гарадской плошчы адбыўся агульнагарадскі мітынг рабочых горада. Сюды прышлі з аркестрамі, пад чырвонымі сцягамі рабочыя фабрык і заводаў, служачыя, працоўная інтэлігенцыя.

Мітынг адкрыў па даручэнню часовага ўпраўлення тав. Гершман. З інфармацыяй аб прынятай Народным Сабраннем Заходняй Беларусі дэкларацыі аб дзяржаўнай уладзе выступіў упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па партыйнай рабоце тав. Гімельштэйн.

— Ад гэтага часу над горадам Пінскам, — гаворыць ён, — як і над ўсімі гарадамі, сёламі, мястэчкамі і вёскамі Заходняй Беларусі — палыхае сцяг Советаў. Ад гэтага часу наступае новая эра, эра будаўніцтва новага, шчаслівага, совецкага жыцця, жыцця без эксплаатацыі чалавека чалавекам, без гнёту і свавольства

Рабочы запалкавай фабрыкі тав. Гольдзін гаворыць аб вялікай радасці працоўных Заходняй Беларусі:

— Уся ўлада ў Заходняй Беларусі належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Советаў дэпутатаў працоўных. Аб гэтым мы доўга марылі. І ў гэты радасны і шчаслівы для нас час мы шлем сваё гарачае прывітанне таму, хто нас вызваліў ад жуласнага гнёту — нашаму бацьку, другу, вызваліцелю таварышу Сталіну.

І па ўсёй плошчы раздаюцца воклічы: «Ура!», «Няхай жыве вялікі Сталін!»

— Хоць на вуліцы і дрэннае надвор'е, — гаворыць рабочы тав. Собаль. — але ў нас на сэрцы светла і радасна. Мы ўліліся ў адзіную сям'ю вялікага Совецкага Саюза. Наша жыццё заквітнее пышным садам, як квітнее жыццё працоўных ў краіне Советаў.

Выступаюць рабочыя тт. Голер, Мандэльштам. Яны таксама выказваюць глыбокую радасць працоўных і вітаюць дэкларацыю Народнага Сабрання.

Ад імені байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Чырвонай Арміі працоўных горада вітаў тав. Кас'янчык

— Будуйце па-совецку новае жыццё,— гаворыць ён. — А байцы, камандзіры і палітработнікі слаўнай Чырвонай Арміі стаяць на варце вялікіх заваёў, на варце інтэрэсаў народа. Ніхто ніколі не пахісне наша магутнае адзінства і інтэрнацыянальную дружбу народаў

Доўга гучыць на плошчы магутнае «ура» ў чэсць слаўнай Чырвонай Арміі. Мітынг закончан. З усіх канцоў нясуцца воклічы: «Няхай жыве вялікі Сталін!», «Няхай жыве наша вызваліцельніца — гераічная слаўная Чырвоная Армія!» Усе прысутныя спяваюць пабеданосны пролетарскі гімн — «Інтэрнацыянал»

Б. ЗЕЛІКСОН.

ДЛЯ НАС АДКРЫЎСЯ СВЕТ РАДАСЦІ І ШЧАСЦЯ

СЛОНІМ, 31 кастрычніка. (БЕЛТА). 450 рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў лесапільных, цагельных і кафельных заводаў Слоніма сабраліся ў гарадскі тэатр на мітынг, прысвечаны рашэнням Народнага Сабрання Заходняй Беларусі.

Доўга незмаўкаючымі апладысментамі сустракаюць прысутныя паведамленне тав. Шалуна аб прынятых Народным Сабраннем дэкларацыях І калі закончылася чытанне дэкларацый, тэатр зноў напаўняецца бурнай авацыяй. Раздаюцца воклічы ў чэсць совецкага ўрада, партыі большэвікоў, вялікага Сталіна, доблеснай Чырвонай Арміі, вызваліўшых працоўных Заходняй Беларусі ад гнёту польскіх паноў.

Выступае рабочы Мінчук. Ён гаворыць:

— Мы з радасцю даведаліся, што нашы выбраннікі ў Народным Сабранні Заходняй Беларусі аднадушна рашылі ўстанавіць на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўладу Советаў і выказаліся за далучэнне Заходняй Беларусі да Беларускай Совецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Нашай радасці няма граніц. Мы будзем дружна працаваць на карысць свайго народа, сваёй сацыялістычнай радзімы, ніколі і нікому не аддадзім атрыманага шчаслівага жыцця.

— Чалавек працы, — гаворыць рабочы тав. Герман, — у былой панскай Польшчы быў прыгнечан, быў асуджан на смерць ад голаду. Зараз перад намі адкрыўся другі, новы свет, свет радасці, шчасця, заможнага і культурнага жыцця.

Мы аднадушна далучаемся да рашэння нашых выбраннікаў у Народным Сабранні аб устанаўленні совецкай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Мы абяцаем з падвоенай энергіяй працаваць на заводах, каб дастойна сустрэць XXII галавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі.

У заключэнне мітынга прысутныя з вялікім натхненнем спяваюць «Інтэрнацыянал».

* * *

Многалюдныя мітынгі, прысвечаныя заканчэнню работ Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, адбыліся ў Валкавыску, Стаўбцах і другіх гарадах, мястэчках і вёсках Заходняй Беларусі. Усюды з вялікім натхненнем сустракаецца паведамленне аб прынятых Народным Сабраннем рашэннях.

З РАДАСЦЮ УВАХОДЗІМ У СЯМ'Ю НАРОДАЎ СОВЕЦКАГА САЮЗА

ЛУНІНЕЦ, 31 кастрычніка. (БЕЛТА). Па ўсяму Лунінецкаму павету — у гарадах і вёсках адбыліся многалюдныя мітынгі, прысвечаныя заканчэнню работ Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Аднадушна вітаючы рашэнні Народнага Сабрання, выступаўшыя на мітынгах выказваюць сваю безмежную радасць, сваё шчасце і задавальненне.

На мітынгу ў Чучэвічах выступіў селянін Капля Грыгорый. Ён сказаў:

— Вызвалены народ з вялікай радасцю ўваходзіць у дружную, шчаслівую сям'ю народаў вялікага Совецкага Саюза. Ад імені ўсіх сялян нашай вёскі перадаю падзяку правадыру народаў вялікаму Сталіну, доблеснай Чырвонай Арміі за вызваленне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад гнёту польскіх паноў.

Больш 3.000 чалавек прысутнічала на мітынгу ў горадзе Лунінцу. Усе выступаўшыя — чыгуначнікі тт. Смалякоў, Куліновіч, Суета, Міхан, настаўнік Навіцкі, селянін Барэніц і другія—гаварылі аб сваёй бязмежнай радасці. Усе яны аднадушна віталі рашэнні Народнага Сабрання, якое выканала волю працоўных Заходняй Беларусі.

Народнае Сабранне выканала волю народа

БРЭСТ-ЛІТОЎСК, 31 кастрычніка. (БЕЛТА). Вестка аб прыняцці Народным Сабраннем дэкларацыі аб устанаўленні на тэрыторыі Заходняй Беларусі совецкай улады, аб уваходжанні ў састаў БССР з хуткасцю маланкі абляцела ўсе вёскі Матыкальскай воласці.

1.500 сялян вёсак Кленікі, Рэчыца, Казловічы, Неплі, Капельня-Баярска, Шумакі, Костычы і другіх сабраліся на мітынг Ва ўсіх на сэрцы вялікая радасць. Кожны перажывае хвалюючыя пачуцці новага жыцця.

На мітынгу з гарачымі прамовамі выступілі сяляне Мажарэвіч, Раманюк, Бісюк, Шэўчук, Сінюк. Кожны з іх гаварыў аб праклятым мінулым жыцці пад ігам польскіх памешчыкаў і капіталістаў, прыводзіў безліч прыкладаў цяжкага жыцця сялян сваіх вёсак, гаварыў аб наступіўшых радасных днях шчаслівага жыцця, прынесенага абяздоленаму народу Заходняй Беларусі доблеснымі палкамі Чырвонай Арміі.

У аднагалосна прынятай рэзалюцыі ўдзельнікі мітынга заяўляюць:

— Мы горача вітаем рашэнні Народнага Сабрання, якое выканала нашу волю і нашы жаданні. Мы ўсе, як адзін, яшчэ цясней згуртуемся вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна, будзем бязлітасна выкарчоўваць рэшткі прытаіўшыхся ворагаў народа — паймітаў памешчыкаў і капіталістаў.

Пад бурныя апладысменты і воклічы «ура» аднагалосна прымаецца тэкст прывітальнага пісьма таварышам Сталіну, Молатаву, Варашылаву.

70-ТЫСЯЧНАЯ НАРОДНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ І ПАРАД ВОЙСК У БЕЛАСТОКУ

БЕЛАСТОК, 30 кастрычніка. (Спец. кар. «Звязды»). Мала хто астаўся сядзець дома ў гэту асеннюю раніцу. Яшчэ на лосвітку падняўся пранізваючы вецер. Ён прадаўжаўся цэлы дзень. Але ні халодны вецер, ні асенняе хмарнае неба нікога не спынілі. Раніцой увесь горад падняўся на ногі і забурліў па-асаблівому, святочна і велічна. Прадстаяла вялікая ўрачыстасць. Падыходзіла да канца работа Народнага Сабрання Заходняй Беларусі.

Уздоўж вуліц бясконцай лентай выстраіліся калоны дэманстрантаў. Іх позіркі, мысліі, пачуцці накіраваны да гаракскога тэатра, дзе ў гэтыя мінуты прадстаўнікі народа пасяхова завяршаюць гістарычную па сваёй значымасці, дзяржаўную, гістарычную работу.

Яшчэ ўчора вечарам па гораду маланкай пранеслася радасная вестка, што Народнае Сабранне абвясціла на тэрыторыі Заходняй Беларусі Совецкую ўладу і вынесла рашэнне аб уваходжанні ў Вялікі Совецкі Саюз. Стала таксама вядома, што дэпутаты Народнага Сабрання аднагалосна прынялі дэкларацыі аб канфіскацыі памешчыцкай зямлі і аб нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці.

Ніхто не сумняваўся, што дэпутаты Народнага Сабрання вырашаць гэтыя пытанні іменна так, як таго жадалі іх выбаршчыкі. Так, і толькі так. Інакш і не магло быць, бо Народнае Сабранне — гэта сапраўднае ўвасабленне народа, бо дэпутаты — гэта яго лепшыя сыны, кроў ад крыві плоць ад плоці.

З трыбуны Народнага Сабрання мандатная камісія вуснамі дэпутата ад Брэст-Літоўска тав. Карасёва дакладвала аб саставе дэпутатаў. Якімі пераканаўчымі цыфрамі аперыраваў дакладчык! Яны паказваюць, каму даверана рашаць лёс народа. Яны выносяць смяротны прыгавор наскрозь гнілым, прагным і подлым «ясна-вельможным» бандытам з вялікай дарогі, якія сваімі драпежнымі кіпцюрамі доўгія годы раздзіралі душу і цела народа Заходняй Беларусі.

У польскім сейме засядалі 27 памешчыкаў. 41 фабрыкант, 43 буйныя чыноўнікі, 9 генералаў і афіцэраў. 11 ксяндзоў. 63 ураднікі.

— У Народным Сабранні, — гаворыць дакладчык, — засядаюць 926 дэпутатаў народа. Сярод іх 563 селяніна, 197 рабочых, 112 прадстаўнікоў працоўнай інтэлігенцыі. Тут вы не знойдзеце ніводнага памешчыка і фабрыканта, ні аднаго банкіра і паліцэйскага.

Дэпутатаў Народнага Сабрання з нецярпеннем чакалі на запруджаных народам вуліцах.

Нарэшце яны з'явіліся. На іх усхваляваных тварах дэманстранты прачыталі: «Народ перамог!».

70 тысяч беластачан удзельнічалі ў гэтай, прысвечанай сканчэнню работы Народнага Сабрання, грандыёзнай, незабыўнай дэманстрацыі. Бясконцым патокам цягнуліся калоны дэманстрантаў. У сваіх руках яны беражна нясуць партрэты дарагіх правадыроў — Леніна, Сталіна і іх баявых саратнікаў. Над калонамі дэманстрантаў палыхаюць алыя сцягі, лозунгі, транспаранты. Задушэўна і бадзёра гучаць баявыя рэволюцыйныя песні. Калоны дэманстрантаў рухаюцца з цэнтра горада к полю, дзе ў чаканні ваеннага парада выстраіліся часці Чырвонай Арміі.

Павольна, абганяючы дэманстрантаў, к месцу парада на адкрытых машынах едуць дэпутаты Народнага Сабрання. Народ іх вітае бурна, усхвалявана. Штомінутна па калонах праносіцца гучнае «ура». Ва ўсіх на вуснах любімае імя — Сталін.

... Задрапіраваная чырвоным бархатам трыбуна. Партрэты Леніна, Сталіна, кіраўнікоў большэвіцкай партыі і совецкага ўрада. Ва ўрачыстым маўчанні, чакаючы пачатку парада, застылі часці Беластоцкага гарнізона. Навакол гучаць бадзёрыя песні. Ізесьці, далёка за горадам, аддаецца рэха гучных выкрыкаў «ура».

Першая гадзіна дня. На трыбуну падымаюцца сакратары ЦК КП(б)Б тт. Панамарэнка, Грэкава, Малін, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав Наталевіч, старшыня Соўнаркома БССР тав. Кісялёў, Нарком унутраных спраў тав. Цанара, дэпутаты Народнага Сабрання і прадстаўнікі працоўных горада.

Тав. Чэрнякоў прымае парад. Камандуючы парадам тав. Ерэменка рапартуе:

— Часці Беластоцкага гарнізона пастроены для парада.

Мелзь аркестра далёка разносіць гукі «Інтэрнацыянал» тав. Чэрнякоў, аб'язджаючы часці, вітаецца з байцамі. Усе камандзіры, палітработнікі, байцы узгадзіваюць здравіцу ў чэсць Народнага Сабрання Заходняй Беларусі, у чэсць вялікага Сталіна

Па ўсёй плошчы разносіцца грамавое многакратнае «ура»

Затым тав. Чэрнякоў падымаецца на трыбуну і гаворыць кароткую палкую прамову. Ён гаворыць аб слаўнай Чырвонай Арміі, якая з чэсцю і славай выканала ўскладзеную на яе гістарычную задачу па вызваленню народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

— Наша Чырвоная Армія ахоўвае мірную працу працоўных,—гаворыць тав. Чэрнякоў. — Але калі спатрэбіцца, яна стане самай нападаючай з усіх армій у свеце і разграміць ворага на яго ўласнай тэрыторыі

Гэтыя словы тонуць у бясконцых крыках «ура», у шквале прывітальных воклічаў.

Дзесяткі тысяч удзельнікаў дэманстрацыі бурна вітаюць правадыра народаў таварыша Сталіна і слаўную Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію.

...Пачаўся парад. Ашчаніўшы штыкі, чаканным крокам, у сталёвых шлёмах праходзіць пяхота. Плошча на мінуту пусцее. Затым рыссю праносіцца кавалерыя ў стальных шлёмах, пад ліхой конніцай развяваюцца баявыя чырвоныя сцягі. Віхрам праносяцца кулямётныя тачанкі.

Поле агалашаецца грукатам артылерыі.

Велічна выглядае парад.

Гэта была цудоўная дэманстрацыя абаронай магутнасці Вялікага Совецкага Саюза. Народ Заходняй Беларусі яшчэ раз убачыў сілу Чырвонай Арміі, прынесшай яму вызваленне.

Што адчувалі і аб чым думалі ў гэты час дзесяткі тысяч працоўных Беластока і дэпутаты Народнага Сабрання, якія любаваліся парадам? Яны радаваліся і захапляліся, як дзеці. Яны бясконца выкрыквалі словы ўдзячнасці Чырвонай Арміі за вызваленне ад векавога гнёта. Яны пераканаліся, на якія пулы здольны совецкі народ. Яны ў гэты час думалі аб тым, якой жалкай была польская армія ў параўнанні з усёперамагаючай, аснашчонай перадавой тэхнікай, адзінай у свеце арміі рабочых і сялян.

— З такой арміяй, — дзяліўся сваімі ўражаннямі стаяўшы каля нас ўдумлівы селянін, — можна будзе размалоць косці самаму моцнаму ворагу, калі ён толькі асмеліцца палезці на Совецкую краіну. І так закапаць, каб грава над ім не расла.

Але гэта не ўсё, аб чым думалі ў гэтыя мінуты тысячы людзей.

Разам з пачуццём любві да Чырвонай Арміі сёння з новай сілай гаворыць пачуццё гордасці. Мы чулі, як многія дэпутаты гаварылі паміж сабою:

— Вось яна, якая магутная наша Чырвоная Армія!

Цяпер беластачане, гаворачы аб Чырвонай Арміі, з гордасцю дадаюць: наша.

Народ гардзіцца Чырвонай Арміяй, адчувае і разумее, што гэта грозная для ворага сіла з'яўляецца арміяй яго краіны.

І гаму найвялікшым шчасцем ззялі вочы 70 тысяч чалавек, неадрыўна сачыўшых за парадам Чырвонай Арміі.

І. ШЛЯФЕР,

С. КАЗНАЧЭЕЎ.

За рубяжом

ПРЫБЫЦЦЁ СОВЕЦКІХ ВОЙСК У ЛАТВІЮ

СТ. ЗІЛУПЕ (ЛАТВІЯ), 30 кастрычніка. (ТАСС). Часці Чырвонай Арміі прыбылі ўчора ў дружаственую Латвію і накіраваліся да ўстаноўленых совецка-латвійскім дагаворам баз.

Прыбыўшыя часці Чырвонай Арміі былі сустрэты прадстаўнікамі паўпрэдства СССР у Латвіі на чале з паўпрэдам тав. Зотавым, прадстаўнікамі камандавання латвійскай арміі на чале з генералам Клінсонам.

Газета „Лайкас" аб звароце Вільна Літве

КАУНАС, 30 кастрычніка. (ТАСС). У сувязі з уступленнем часцей літоўскай арміі ў Вільна газета «Лайкас» сёння піша:

«Нельга забываць, у якіх абставінах мы атрымалі Віленскую абласць. Мы атрымалі яе па свабоднаму дагавору з Совецкім Саюзам. Такое мірнае вырашэнне тэрытарыяльнай праблемы, рэдка сустракаючаяся ў гісторыі дзяржаў, без сумнення выклікае многа сімпатый да Совецкага Саюза ва ўсім свеце. Гутарка-ж ішла аб двух зусім розных па велічыні краінах. СССР ажыццявіў дагавор, заключаны з Літвой у 1920 г., па якому горад Вільна быў перадан Літве. Гэтая акалічнасць яшчэ больш падкрэслівае шчырасць мірнай палітыкі Совецкага Саюза і сведчыць, што палітыка СССР і ў тыя часы, калі ён быў змучан грамадзянскай вайной, і зараз, калі Совецкі Саюз адыгрывае выдатную ролю ў міжнародных адносінах, была і астаецца пэўнай і паслядоўнай.

Верачы ва ўстойлівасць нашых мірных адносін і ў заявы аб тым, што Совецкі Саюз не намерен умешвацца ва ўнутраную палітыку іншых краін, мы ніколькі не сумняваемся, што зварот Літве горада Вільна з'явіцца тым светачам, які не дапусціць ахаладжэння дружаственых адносін паміж двума дзяржавамі».

Незадаволенне палітыкай выканкома лейбарысцкай партыі

ЛОНДАН, 31 кастрычніка. (ТАСС). «Дэйлі ўоркер» паведамляе, што ад мясцовых арганізацый лейбарысцкай і кааператыўнай партый, а таксама ад профсаюзных арганізацый паступаюць у рэдакцыю многалікія рэзалюцыі, у якіх асуджаецца супрацоўніцтва выканкома лейбарысцкай партыі з урадам. Лейбарысцкая арганізацыя Блейдона (графства Дзергам) прыняла рэзалюцыю, у якой патрабуе ад выканкома спынення супрацоўніцтва з урадам, бо гэтае супрацоўніцтва азначае адмаўленне ад абароны справы дэмакратыі. У рэзалюцыі далей заяўляецца, што лейбарысцкі рух павінен быць незалежным ад імперыялізма і палітыкі імперыялістычнай вайны і што трэба пакласці канец супрацоўніцтву з урадам Чэмберлена і выступіць супроць рэакцыйных мерапрыемстваў, маючых мэтай падрыхтаваць глебу для яшчэ большага ўзмацнення рэакцыі ў Англіі.

Лейбарысцкая арганізацыя Хілсборо (Шэффіл) выказалася супроць звароту выканкома лейбарысцкай партыі аб супрацоўніцтве з урадам. Аналагічныя рэзалюцыі прыняты лейбарысцкімі арганізацыямі Іорка, Гейнсборо, Брыджуотэра, Бідфорда, а таксама іншымі камітэтамі лейбарысцкай партыі і многалікімі арганізацыямі кааператыўнай партыі і профсаюзаў.

Рэарганізацыя італьянскага кабінета

ЛОНДАН, 31 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе рымскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, сакратар фашысцкай партыі Старачэ пайшоў у адстаўку і назначан на пост начальніка штаба фашысцкай міліцыі. Маршал Грацыані назначан начальнікам генеральнага штаба арміі. Пайшлі ў адстаўку 6 міністраў. Некаторыя з іх атрымалі іншыя пасты. У ліку пайшоўшых у адстаўку — міністр друку і прапаганды Альфіеры, намеснік ваеннага міністра і начальнік генеральнага штаба арміі генерал Пароцані і намеснік міністра авіяцыі генерал Валле.

Становішча рабочых ва Францыі

ЛОНДАН, 30 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, французскі міністр працы прадставіў на зацвярджэнне прэзідэнта Лебрэна новы законапраект, па якому рабочыя ваенных прадпрыемстваў не маюць права выбіраць месца работы або пакідаць яго без асобага дазволу. Па новаму закону рабочыя абавязаны працаваць такую колькасць гадзін, якую ад іх патрэбуюць. Закон прадугледжвае суровае пакаранне для тых, хто не выконвае новых распараджэнняў. Справы западозраных у сабатажы будуць разглядаць ваенныя суды.

На франтах Кітая

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

У паўночна-заходняй частцы правінцыі Цзянсі ў раёне Фынсіня паміж кітайскімі і японскімі войскамі адбыўся вялікі бой. Японцы страцілі каля 700 чалавек забітымі і ранеными.

У ачышчаных ад японцаў раёнах паўночнай часткі правінцыі Хунань кітайцы прадаўжаюць збіраць кінутую пракляўнікам ваенную маёмасць. У горы Баолай знойдзена 15 камплектаў палявых тэлефонаў і вялікі запас ваеннай маёмасці, кінутай трэцім японскім артылерыйскім палком.

Згодна кітайскіх паведамленняў, за апошнія дні заўважна ўзрастае дзейнасць кітайскіх партызан вакол Шанхая. Партызанскія атрады, аперыруючыя ўзлоўж шасейных дарог на поўдзень ад Шанхая, прасоўваюцца да горада. У раёне Путуна (паўднёвы раён Шанхая) японцы сканцэнтравалі вялікія сілы, чакаючы атак з боку партызан. Многа кітайскіх партызан падыходзіць да Шанхая з поўначы. Партызаны ўступаюць у бой з асобнымі японскімі атрадамі, а таксама нарушаюць японскія камунікацыі.

Па паведамленню газеты «Дамэйбао», 28 кастрычніка на Шанхай-Нанкінскай чыгунцы недалёка ад Усі пацярпеў крушэнне японскі воінскі поезд ад узрыву міны, закладзенай партызанамі пад палатно чыгункі. 13 вагонаў з японскімі салдатамі зляцелі пад адкос. Ёсць многа афяр.

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

У заходняй частцы правінцыі Шаньсі кітайскія войскі ў рэзультаце бесперапынных атак на Сяннін (на паўднёвы ўсход ад Цзічжоу) вымусілі японцаў выйсці з гэтага горада. У раёне Аньцзе (на ўсход ад Хундуна) за апошнія дні адбываюцца жорсткія баі.

22 кастрычніка кітайскія партызаны ўзарвалі японскі воінскі поезд на Лунхайскай чыгунцы.

У ПАЎДНЁВЫМ КІТАІ

У раёне Цзянмыня (на поўдзень ад Кантона) прадаўжаюцца баі. 29 кастрычніка японскія войскі пасля артылерыйскай падрыхтоўкі прадпрынялі наступленне на кітайскія пазіцыі на захад ад Цзянмыня. Кітайскія войскі, палпусціўшы непрыяцеля на блізкую аддегласць перайшлі ў рукапашны бой і адбілі японскае наступленне.

29 кастрычніка шэсць японскіх самалётаў бамбардыравалі гарады ў паўднёвай частцы правінцыі Фуцзянь. 28 кастрычніка ў той-жа правінцыі 11 японскіх самалётаў бамбардыравалі рад гарадоў у раёне ракі Мінь.

ВАЙНА Ў ЕЎРОПЕ

ПАВЕДАМЛЕННЕ ВЯРХОЎНАГА КАМАНДАВАННЯ ГЕРМАНСКАЙ АРМІІ

БЕРЛІН, 31 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе: «На захадзе паміж Мозелем і Пфальцскім лесам слабая артылерыйская і разведчая дзейнасць. На астатніх участках фронта — без змен. Збіта чатыры непрыяцельскіх самалёты».

ФРАНЦУЗСКАЕ КАМУНІКЕ АБ ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯХ

ПАРЫЖ, 31 кастрычніка. (ТАСС). У пераданым сёння агенцтвам Гавас камунікеаб ваенных дзеяннях паведамляецца, што ноч прайшла спакойна па ўсяму фронту.

***

ПАРЫЖ, 31 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Гавас перадае наступнае камунікеаб ваенных дзеяннях, апублікаванае ў Парыжы ўчора вечарам: «Па ўсяму фронту назіраецца актыўнасць асобных часцей. На розных участках фронта адбываецца артылерыйская перастрэлка. Назіраецца ўзмоцненая дзейнасць разведчай авіяцыі і знішчальнікаў.

За першыя два месяцы вайны Францыя страціла 6 камерчаскіх параходаў агульным водазмяшчэннем у 41 тыс. тон. У той-жа час Францыя захапіла 4 параходы, з якіх «Халле» быў патоплен. Тры іншыя параходы агульным водазмяшчэннем у 19 тыс. тон скарыстаны для патрэб Францыі. Такім чынам з пачатку ваенных дзеянняў танаж французскага гандлёвага флота зменшыўся на 22 тыс. тон».

БОЙ ПАМІЖ АНГЛІЙСКІМІ ЭСМІНЦАМІ І ГЕРМАНСКІМІ БАМБАРДЫРОЎШЧЫКАМІ

ЛОНДАН, 31 кастрычніка. (ТАСС). Англійскае марское міністэрства паведамляе, што ўчораа ў паўднёвай частцы Доггербанк (Паўночнае мора) англійская флатылія эсмінцаў падверглася нападу двух германскіх бамбардыроўшчыкаў. Эсмінцы ніякіх пашкоджанняў не атрымалі.

РАЗВЕДЧЫЯ ПАЛЁТЫ АНГЛІЙСКІХ САМАЛЁТАЎ

ЛОНДАН, 31 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, англійскае міністэрства авіяцыі заявіла, што «ўчора англійскія ваенныя самалёты зрабілі разведчыя палёты над аэрадромамі ў паўночнай частцы Германіі. Не гледзячы на дрэннае надвор'е і процідзеянне непрыяцеля, было зроблена многа фотаздымкаў і атрыманы каштоўныя весткі».

Паведамляецца таксама, што адзін з англійскіх самалётаў не вярнуўся на сваю базу.

ДЗЕЯННІ ФРАНЦУЗСКАЙ АВІЯЦЫІ

ЛОНДАН, 30 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ад пачатку вайны французскія самалёты зрабілі звыш 250 дзённых і 74 начных разведчых палётаў. Па вестках агенцтва, ад 20 кастрычніка французскі ваенна-паветраны флот страціў 8 самалётаў.

ВАЙНА НА МОРЫ

НЬЮ-ЁРК, 31 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Асошыэйтэд Прэс, учора былі патоплены тры англійскія і адзін нарвежскі параход. Такім чынам, з пачатку вайны патоплена або затанула, наштурхнуўшыся на міны, усяго 102 параходы розных краін агульным танажам каля 411 тысяч тон. У ліку загінуўшых параходаў: 56 англійскіх і 30—нейтральных краін. Загінула 1850 чалавек.



РЫХТУЮЦЦА ДА СВЯТКАВАННЯ XXII ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА. У авіялабараторыі Магілеўскай дзіцячай тэхнічнай станцыі — за падрыхтоўкай мадэлей да кастрычніцкай дэманстрацыі. Злева інструктар Г. Ф. Каласоўскі.
Фото А. Н. Розельмана. (Фотахроніка БЕЛТА).

ПАДРЫХТОЎКА ДА XXII ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІЦКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

ВІЦЕБСК У СВЯТОЧНЫЯ ДНІ

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). Працоўныя горада ўзмоцнена рыхтуюцца да вялікага свята XXII гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Брыгады лепшых мастакоў працуюць над мастацкім афармленнем горада. Пл. Свабоды будзе афармлена на тэму «Вызваленне доблеснай Чырвонай Арміяй працоўных Заходняй Беларусі ад іга польскіх памешчыкаў і капіталістаў». Вялікае мастацкае панно з партрэтам таварыша Сталіна ў цэнтры адлюструе радасную сустрэчу Чырвонай Арміі з працоўнымі Заходняй Беларусі.

«Чэснай і самаадданай працай на сваім участку ўмацуем абароназдольнасць краіны» — такава тэма афармлення пл. Леніна. Тут будуць красавацца партрэты знатных людзей нашай краіны — многастаночнікаў, жанчын, якія авалодваюць вядучымі працэсамі, і іншых наватараў соцыялістычнай вытворчасці.

Яркімі красачнымі калонамі выйдуць працоўныя Віцебска на кастрычніцкую дэманстрацыю. Сямітысячная калона калектыва чулочна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ» будзе афармлена на тэму «Палітыка міру СССР і дружба народаў». Чыгуначнікі, швейнікі, металісты, інтэлігенцыя на сваіх шматлікіх яркіх лозунгах і плакатах адлюструюць радаснае жыццё народаў СССР, сваю радасць вызвалення адзінакроўных братоў Заходняй Беларусі, сваю гарачую любоў да доблеснай РСЧА і бязмежную адданасць партыі Леніна—Сталіна, яе правадыру—вялікаму Сталіну.

У дні свята на плошчах і вуліцах горада выступяць артысты Беларускага драматычнага тэатра і калектывы мастацкай самадзейнасці.

ПОМНІК В. І. ЛЕНІНУ

ЗАСЛАЎЛЬ. Да дня вялікага свята XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў гарадскім пасёлку будзе адкрыт помнік вялікаму правадыру працоўных — генію чалавецтва Уладзіміру Ільічу Леніну. Помнік устанаўліваецца ў цэнтры новага сквера.

ПАБУДАВАНЫ ДЗІЦЯЧЫЯ ЯСЛІ

ХОЙНІКІ. У раённым цэнтры адкрыты новыя дзіцячыя яслі на 50 месц. На будаўніцтва іх расходвана 187 тыс. рублёў. Ля ўваходу ў яслі на вялікім пэментным кругу пастаўлена прыгожая скульптура — група дзяцей. У 11 светлых і ўтульных пакоях ужо размясцілася 35 дзяцей.

Інструкцыйныя даклады для агітатараў

ЖУРАВІЧЫ. РК КП(б)Б арганізаваў для агітатараў і бяседчыкаў інструкцыйныя даклады і лекцыі. Днямі ў памяшканні раённага дома соцкультуры была праведзена лекцыя на тэму «Партыя большэвікоў у перыяд падрыхтоўкі і правядзення Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі». На лекцыі, апрача дакладчыкаў і палітбяседчыкаў, прысутнічала больш 100 чалавек партыйна-комсамольскага актыва і інтэлігенцыі.

У клубе аршанскіх чыгуначнікаў

ОРША. Гурткі мастацкай самадзейнасці аршанскага чыгуначнага клуба імені С. М. Кірава з вялікай актыўласцю рыхтуюцца да XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Драматычны гурток рэпетыруе п'есу «Слава» Гусева. У галоўных ролях выступяць машыністы тт. Андрэеў і Салтановіч, хатняя гаспадыня Дубецкая і інш. Узмоцнена рыхтуюцца да святочных канцэртаў джазаркестр і харавы ансамбль. Яны развучваюць беларускія народныя і сучасныя совецкія песні.

У клубе арганізуецца выстаўка літаратуры і фото, якая адлюструе шчаслівае і радаснае жыццё працоўных нашай краіны. Наладжваецца лекцыя на тэму «Кастрычнік у мастацкай літаратуры».

КАНЦЭРТ ЛЕНІНГРАДСКІХ МАЙСТРАЎ МАСТАЦТВА

30 кастрычніка ў Беларускім дзяржаўным тэатры оперы і балета адбыўся канцэрт брыгады ленінградскіх артыстаў, якая вярнулася з Заходняй Беларусі. Кіраўнік брыгады, народны артыст РСФСР, двойчы ордэнаносец т. Чэркасаў перадаў прывітанне працоўным сталіцы БССР ад працоўных гор. Ленінграда.

З вялікай цікавасцю былі праслуханы на канцэрце маналог прафесара Палежаева з кінофільма «Дэпутат Балтыкі» ў выкананні Чэркасава і прамова Чапаева з кінофільма «Чапаеў» (выканаўца, народны артыст РСФСР ордэнаносец Бабачкін).

Гледачы доўга віталі любімых герояў выдатных совецкіх кінофільмаў. З поспехам на канцэрце выступалі спевакі — заслужаныя артысты РСФСР Нечаеў і Вольтэр, салісты балета Ленінградскага акадэмічнага тэатра імені Кірава Балабіна, Лапухова і Арлоў, артысты Лендзяржэстрады і інш. Увесь канцэрт майстраў ленінградскага мастацтва прайшоў у шчырай сяброўскай атмасферы.

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СПАБОРНІЦТВА

Вайсковая часць на працягу апошняга года трымае пярэдняе месца па баявой і палітычнай падрыхтоўцы. Перадкастрычніцкае сацыялістычнае спаборніцтва з'явілася стымулам для яшчэ лепшай барацьбы за высокія паказальнікі баявой вучобы.

Па даных папярэдняй праверкі выканання перадкастрычніцкіх абавязацельстваў 92 проц. байцоў засвоілі праграму палітпадрыхтоўкі на «выдатна» і «добра». Аналагічныя паказальнікі і па баявой падрыхтоўцы.

У падраздзяленнях часці праведзены гутаркі аб XXII гадавіне Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. У ленінскіх пакоях абсталёўваюцца спецыяльныя вітрыны, якія адлюстроўваюць дасягненні нашай краіны. Рыхтуюцца дошкі пачоту, у якіх будуць змешчаны фотаздымкі выдатнікаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі. 8 лепшых байцоў часці занесены на дошку пачоту ў газеце «На варце». У ліку занесеных малодшы камандзір комсамолец тав. Камінскі, які мае 31 заахвочванне.

У дні святкавання слаўнай гадавіны лепшыя байцы часці будуць несці сталінскую вахту. Права нясення вахты ўжо заваявала ўдарнае падраздзяленне малодшага лейтэнанта тав. Цымбаліста. Байцы гэтага падраздзялення тт. Брыкалаў, Андрыянаў і Налівайка маюць па 11 заахвочванняў.

Дзейная падрыхтоўка ідзе да стралковых спаборніцтваў, якія будуць праведзены ў перадкастрычніцкія дні. Жонкі камандзіра, палітычнага і начальніцкага састава да свята здаюць нормы на значкі ППХА. Наладжваецца экскурсія чырвонаармейцаў у музей Рэволюцыі.

Да свята заканчваецца капітальны рамонт і пераабсталяванне клуба часці. Рыхтуецца вялікая праграма мастацкай самадзейнасці. Драматычны гурток пад кіраўніцтвам тав. Старцэнка рэпетыруе п'есу «Высокае чувство». Хор, якім кіруе чырвонаармеец тав. Сакалоўскі, на ўрачыстым вечары выканае «Песню аб Сталіне», «Чырвонафлоцкую» і рад іншых нумароў. Цікавую праграму выступлення рыхтуе таксама джаз-аркестр. **ГОРФІНКЕЛЬ.**

БАЙЦЫ РЫХТУЮЦЦА ДА СВЯТА

ГРОДНА, 27 кастрычніка. (Па тэлефону). Удзельнікі мастацкай чырвонаармейскай самадзейнасці Н-скай часці ўзмоцнена працуюць над новымі пастаноўкамі, прысвечанымі святкаванню XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Пад кіраўніцтвам тав. Неміра рыхтуецца літаратурны мантаж аб гераічных днях вызвалення народаў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

У святочныя дні чырвонаармейцы і камандзіры часці ўбачаць на сцэне клуба два скетчы. З вялікай праграмай выступіць джаз-аркестр.

Вялікую актыўнасць праяўляюць у падрыхтоўцы вечара самадзейнасці чырвонаармейцы Фетчанка, Васільеў і нам. палітрука тав. Лебедзеў.

***

У Заходняй Беларусі гастраліруе заслаўскі соўгасна-калгасны тэатр. Гэты тэатральны калектыў вельмі малады, але пастаноўкі яго носяць адпячатак зрэлага майстэрства. Артысты тэатра пабывалі і ў Н-скай часці. Адбыўся вялікі канцэрт, у праграме якога былі песні, музыкальныя творы совецкіх кампазітараў.

Добрае ўражанне на гледачоў зрабілі рускія і беларускія песні і пляска.

Чырвонаармейцы дзякуюць артыстаў за добры канцэрт. **Б. ЗЕЛЬЦЗР.**

ДЗЁННІК

2 лістапада, у 7 гадзін веч., у Доме партактыва (вялікі зал) адбудзецца сход хатніх гаспадынь Сталінскага раёна, прысвечаны XXII гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Білеты атрымаць у РК КП(б)Б.

В. а. адказнага рэдактара Т. С. ГАРБУНОЎ.

ВЯЛІКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

7 лістапада — абанемент № 122.

ДРЫГВА

8 лістапада — прэм'ера

САЛАВЕЙ

Абанемент № 123.

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

Сёння спектакля няма.
2 лістапада. Абанемент № 40.

«ХТО СМЯЕЦЦА АПОШНІМ»

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

1 лістапада

ПАВЕЛ ГРЭКАЎ

Пачатак у 8 гадзін вечара.

Абанемент № 3.

Кінотэатр «РОДИНА»
«НОЧЬ В СЕНТЯБРЕ»

Кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»

ДОКТАР АЙБАЛІТ

Кінотэатр «СПАРТАК»

ПАРТЫЙНЫ БІЛЕТ

Дзіцячы кінотэатр

«СТЕПАН РАЗИН»

Кінотэатр «НАВІНЫ ДНЯ»
1. Ля ціхага Дона (кінонарыс).
2. Лагер ля мора (кінонарыс).
3. Журнал маскоўскай кіностудыі кінохронікі № 93.
4. Далёкаўсходнія частушкі.

Кінотэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

СЁННЯ НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

„ВЫСОКАЯ НАГРАДА"

АБ БАРАЦЬБЕ СОВЕЦКАЙ РАЗВЕДКІ З ЗАМАСКІРАВАЎШЫМІСЯ ВОРАГАМІ НАРОДА І АБ ПАТРЫЯТЫЗМЕ СОВЕЦКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ.

Сцэнарый Ігара САЎЧЭНКА. | Аператар—Александр ШЭЛЕНКОЎ.
Рэжысёр — Еўгеній ШНЕЙДЭР. | Кампазітар — В. ЮРОЎСКІ.

У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:

Заслуж. артыст. рэспублікі Н. СВАБОДЗІН. | Заслуж. артыст. рэспублікі — П. МАСАЛЬСКІ.
Артыст-ордэнаносец — А. АБРЫКОСАЎ. | Заслуж. артыст. рэспублікі — Б. ПЕТКЕР і інш.
Артыст-ордэнаносец — М. ТРАЯНОЎСКІ.

ПАЧАТАК СЕАНСАЎ: 6, 7.30, 9.15 і 11 г. веч.

Каса адкрыта з 1 гадзіны дня.

У ФАЙЕ ВЫСТУПЛЕННІ СІМФАНІЧНАГА АРКЕСТРА пад кіраўніцтвам Н. П. КЛАУСА.

ГАРАДСКАЯ ТРАНСЛЯЦЫЙНАЯ РАДЫЁСЕЦЬ

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ЎЛАДАЛЬНІКАЎ РАДЫЁТОЧАК, што

запазычанасць па абанементнай плаце

НЕАБХОДНА ЛІКВІДАВАЦЬ ЗАРАЗ-ЖА.

Абанементная плата павінна быць аплочана не пазней 22 числа бягучага месяца—уперад за месяц.

У ВЫПАДКУ НЯСВОЕЧАСОВАЙ АПЛАТЫ, БУДЗЕ ЎЗІМАЦЦА ШТРАФ ЗА КОЖНЫ ПОЎНЫ І НЯПОЎНЫ МЕСЯЦЫ, ПАДЛЯГАЮЧЫЯ АПЛАЦЕ.

Райкасы Белкомунбанка працуюць з 15 да 20 гадзін.

Каса радыёсеці (Совецкая, 33) працуе з 9 да 19 гадзін, апрача агульных выходных дзён.

ДА УВАГІ ПАЎПНІКОЎ!

ДА XXII ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА ва ўсе магазіны МІНХАРЧГАНДЛЯ

паступіў поўны асартымент

БАКАЛЕЙНА-ГАСТРАНАМІЧНЫХ, ХЛЕБНА-БУЛАЧНЫХ, КАНДЗІЦЕРСКІХ, ПЛОДАГАРОДНІХ тавараў,

а таксама МЯСА і РЫБА.

НАСТУПНЫЯ БАКАЛЕЙНА-ГАСТРАНАМІЧНЫЯ МАГАЗІНЫ прымаюць ПАПЯРЭДНІЯ ЗАКАЗЫ

З ДАСТАЎКАЙ НА ДОМ і атрыманнем у магазіне: №№ 3, 10, 12, 13, 14, 16, 20, 27, 29, 31, 33, 42, 48, 52, 55, 57, 60, 61, 69, 72, 82, 86, 87, 96, 98, 160, 181.

ЧАС ГАНДЛЮ ВА ЎСІХ МАГАЗІНАХ З 30 КАСТРЫЧНІКА ПАВЯЛІЧАН НА 2 ГАДЗІНЫ.

НЕ ТРАЦЬЦЕ ЧАСУ ЛЯ ПРЫЛАЎКА. КАРЫСТАЙЦЕСЯ ПАПЯРЭДНІМІ ЗАКАЗАМІ І ДАСТАЎКАЙ ТАВАРАЎ НА ДОМ.

Пачынаючы з 4 лістапада магазіны №№ 69 і 165 будуць працаваць КРУГЛЫЯ СУТКІ.

МІНХАРЧГАНДАЛЬ.

ВЫРАЖЫ І ЗБЕРАЖЫ!

Дзяржаўная інспекцыя паляванння і звярагадоўлі ПРЫ НАРКАМЗЕМЕ БССР

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ПАЛЯЎНІЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ЎСІХ ПАЛЯЎНІЧЫХ БССР, што

на тэрыторыі БССР, апрача тэрыторыі Беларускага Дзяржаўнага запаведніка, Чачэрскай бабровай гаспадаркі і заказніка ў Парыцкім раёне,

ДАЗВАЛЯЕЦЦА ПАЛЯВАННЕ У ЗІМОВЫМ СЕЗОНЕ 1939-1940 гг.

НА ЗАЙЦА-РУСАКА, ЗАЙЦА-БЕЛЯКА, БЕЛКУ, ЛІСІЦУ, ТХАРА ЧОРНАГА І ГАРНАСТАЯ З 5 ЛІСТАПАДА 1939 г. ДА 15 ЛЮТАГА 1940 г.

ЗАБАРАНЯЕЦЦА ЎТВАРАЦЬ ПАЛЯВАННЕ на бабра, лася, касулю (дзікую казу), выдру, куніцу, усурыйскага енота, барсука, норку, ласку, глухара, драфу і шэрую курапатку.

ПАЛЯВАННЕ НА ДЗІКАГА КАБАНА ДАЗВАЛЯЕЦЦА ДА 15 ЛЮТАГА 1940 г.

ЗДАБЫВАННЕ КРАТА ДАЗВАЛЯЕЦЦА ДА 15 ЛЮТАГА 1940 г.

ПАЛЯВАННЕ НА ЦЕЦЕРУКОЎ, РАБЧЫКАЎ І БЕЛУЮ КУРАПАТКУ ДАЗВАЛЯЕЦЦА ДА 1 СНЕЖНЯ 1939 г.

На ўсе віды КАЧАК, ГУСЕЙ, ДУПЕЛЕЙ, БЕКАСАЎ, ВАЛЬДШНЕПАЎ, КАРАСЦЕЛЕЙ, ВАДЗЯНЫХ КУРАЧАК, усе віды КУЛІКОЎ, ГАЛУБОЎ І ПЕРАПЕЛАЎ ПАЛЯВАННЕ ДАЗВАЛЯЕЦЦА ДА АСЕННЯГА АДЛЕТУ 1Х — ДА 1 СТУДЗЕНЯ 1940 г.

НА ПРАЦЯГУ ЎСЯГО ГОДА ПАЛЯВАННЕ ДАЗВОЛЕНА НА ВАЎКА, МЯДЗВЕДЗЯ, РЫСЬ, ХАМЯКА, СУСЛІКА, КРЫСУ АМБАРНУЮ, ВАДЗЯНУЮ ПАЛЁЎКУ (крысу) і інш. мышавідных грызуноў: ястраба-цецеравятніка, ястраба-перапелятніка, балотнага луня, чорнага каршака, філіна, арла-беркута, арлана-белахвоста, сокалаў: сапсана, дзеронніка і чаглака, варону і сароку.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ІНСПЕКЦЫЯ ПАЛЯВАННЯ І ЗВЕРАГАДОЎЛІ ПРЫ НКЗ БССР.

МІНАБЛТОРФБУДКЕРАМСАЮЗУ

ПАТРАБУЮЦЦА:

ЭКАНАМІСТ-ПЛАНАВІК для работы ў апараце,
ГАЛОЎНЫЯ БУХГАЛТАРЫ для работы на перыферыі.
Звяртацца: вул. Крапоткіна, 58-а. Тэлефон № 22-090.

ВЫДАВЕЦТВУ «ЗВЯЗДА»

ПАТРЭБНЫ:

ШОФЕРЫ,
КАЧАГАРЫ,
ГРУЗЧЫКІ.

Звяртацца: Совецкая, 49, другі паверх, пакой № 1.

Уп. Галоўлітбела № Б—1747. Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., Л., Ш.